КРАСАВІК
3
СЕРАДА
1940 год
№ 10 (466).
ЦАНА 20 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА САВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР І УПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР

Шостая Сесія Вярхоўнага Совета СССР першага склікання

ДАКЛАД АБ ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫЦЫ ЎРАДА

Старшыні Совета Народных Камісараў і Народнага Камісара Замежных Спраў тав. В. М. МОЛАТАВА на пасяджэнні Вярхоўнага Совета Саюза ССР 29 сакавіка 1940 г.



ТАВАРЫШЫ ДЭПУТАТЫ!

З часу апошняй сесіі Вярхоўнага Совета прайшло пяць месяцаў. За гэты невялікі перыяд адбыліся падзеі, маючыя першаступеннае значэнне ў развіцці міжнародных адносін. У сувязі з гэтым неабходна разглядзець на данай сесіі Вярхоўнага Совета пытанні, якія адносяцца да нашай знешняй палітыкі.

Апошнія падзеі ў міжнародным жыцці неабходна разглядаць, перш за ўсё, у святле вайны, пачаўшайся ў Цэнтральнай Еўропе восенню мінулага года. У вайне паміж англа-французскім блокам і Германіяй да гэтага часу не было вялікіх баёў, і справа абмяжоўвалася асобнымі сутычкамі, галоўным чынам на моры, а таксама ў паветры. Вядома, аднак, што выражанае ў канцы мінулага года імкненне Германіі да міру было адхілена ўрадамі Англіі і Францыі, з прычыны чаго, з абодвух бакоў, падрыхтоўка да разгортвання вайны яшчэ больш узмацнілася.

Германія, аб'еднаўшая за апошні перыяд да 80 мільёнаў немцаў, паставіўшая пад сваё панаванне некаторыя суседнія дзяржавы, і ў многім узмацніўшаяся ў ваенных адносінах, стала, як відаць, небяспечным канкурэнтам галоўных імперыялістычных дзяржаў у Еўропе — Англіі і Францыі. Таму, пад выглядам выканання сваіх абавязацельстваў перад Польшчай, яны аб'явілі вайну Германіі. Цяпер асабліва ясна відаць, як далёкі сапраўдныя мэты ўрадаў гэтых дзяржаў ад інтарэсаў абароны распаўшайся Польшчы альбо Чэха-Славакіі. Гэта відаць ужо з таго, што ўрады Англіі і Францыі агласілі сваімі мэтамі ў гэтай вайне разгром і расчляненне Германіі, хаця гэтыя мэты перад народнымі масамі ўсё яшчэ прыкрываюцца лозунгамі абароны «дэмакратычных» краін і «правоў» малых народаў.

Паколькі Савецкі Саюз не захацеў стаць пасобнікам Англіі і Францыі ў правядзенні гэтай імперыялістычнай палітыкі супроць Германіі, варожасць іх пазіцый у адносінах Савецкага Саюза яшчэ больш узмацнілася, наглядна сведчачы, наколькі глыбокі класавыя карані варожай палітыкі імперыялістаў супроць соцыялістычнай дзяржавы. Пачаўшуюся-ж у Фінляндыі вайну англа-французскія імперыялісты гатовы былі зрабіць адпраўным пунктам для вайны супроць СССР, са скарыстаннем у гэтых мэтах не толькі самой Фінляндыі, але і скандынаўскіх краін — Швецыі і Нарвегіі.

Адносіны Савецкага Саюза да разгортваючайся ў Еўропе вайны вядомы. Прасякнутая міралюб'ем знешняя палітыка СССР і тут была прадэманстрыравана з поўнай выразнасцю. Савецкі Саюз адразу-ж заявіў, што ён стаіць на пазіцыі нейтралітэта і няўхільна праводзіў гэту палітыку на працягу ўсяго прайшоўшага перыяду.

Круты паварот да лепшага ў адносінах паміж Савецкім Саюзам і Германіяй знайшоў сваё выражэнне ў дагаворы аб ненападзе, падпісаным у жніўні мінулага года. Гэтыя новыя, добрыя савецка-германскія адносіны былі праверады на вопыце ў сувязі з падзеямі ў былой Польшчы і дастаткова паказалі сваю моцнасць. Прадугледжанае яшчэ тады, восенню мінулага года, развіццё эканамічных адносін атрымала сваё канкрэтнае выражэнне яшчэ ў жнівеньскім (1939 г.), а затым у лютаўскім (1940 г.) гандлёвых пагадненнях. Таваразабарот паміж Германіяй і СССР пачаў павялічвацца на аснове ўзаемнай гаспадарчай выгады, і ёсць падставы для далейшага яго развіцця.

Нашы адносіны з Англіяй і Францыяй склаліся некалькі па-іншаму. Паколькі Савецкі Саюз не пажадаў стаць зброяй англа-французскіх імперыялістаў у іх барацьбе за сусветную гегемонію супроць Германіі, нам на кожным кроку прыходзілася натыкацца на глыбокую варожасць іх палітыкі ў адносінах нашай краіны. Найбольш далёка справа зайшла ў фінляндскім пытанні, на чым я спынюся пазней. Але і іншых фактаў варожасці французскай і англійскай палітыкі ў адносінах СССР за апошнія месяцы было не мала.

Дастаткова ўказаць, што французскія ўлады не знайшлі нічога лепшага, як наладзіць два месяцы таму назад паліцэйскі налёт на наша гандлёвае прадстаўніцтва ў Парыжы. Праведзены ў гандлёвым прадстаўніцтве вобыск, не гледзячы на ўсе прычэпкі, не даў ніякіх рэзультатаў. Ён толькі аскандаліў ініцыятараў гэтай агіднай справы і паказаў, што ніякіх рэальных поваду для гэтага варожага ў адносінах нашай краіны акту не мелася. Як мы бачым з акалічнасцей справы, звязаных з адклікаем нашага паўнамоцнага прадстаўніка ва Францыі тав. Сурыца, французскі ўрад шукае штучных повадаў, каб падкрэсліць сваю недружалюбнасць у адносінах Савецкага Саюза. Каб было ясна, што Савецкі Саюз не больш зацікаўлен у адносінах паміж абодвума краінамі, чым Францыя, мы адклікалі тав. Сурыца з паста паўпрэда ва Францыі.

Альбо вазьміце такія прыклады варожых у адносінах да СССР актаў, як захват англійскімі ваеннымі суднамі на Далёкім Усходзе двух нашых параходаў, якія ішлі ва Владзівасток з таварамі, закупленымі намі ў Амерыцы і Кітаі. Калі дадаць да гэтага такія факты, як адмаўленне ад выканання нашых старых заказаў на прамысловае абсталяванне ў Англіі, наладжанне арышту на грашовыя сумы гандлёвага прадстаўніцтва ва Францыі і многія іншыя, то варожасць дзеянняў англійскіх і французскіх улад у адносінах Савецкага Саюза будуць бачны яшчэ больш.

Былі спробы апраўдаць гэтыя варожыя ў адносінах нашага знешняга гандлю акты тым, што нашым гандлем з Германіяй мы дапамагаем апошняй у вайне супроць Англіі і Францыі. Не цяжка пераканацца, што гэтыя аргументы не варты ломанага граша. Для гэтага трэба параўнаць СССР хаця-б з Румыніяй. Вядома, што палавіну ўсяго знешняга тавараабароту Румыніі складае гандаль з Германіяй, прычым доля нацыянальнай прадукцыі Румыніі ў экспарце ў Германію, напрыклад, па такіх асноўных таварах, як нафтапрадукты і зярно, намнога перавышае долю нацыянальнай прадукцыі СССР у нашым экспарце ў Германію. Тым не менш, у адносінах Румыніі ўрады Англіі і Францыі не прыбягаюць да варожых актаў і не лічаць магчымым патрабаваць ад Румыніі спынення гандлю з Германіяй. Зусім іншыя адносіны да Савецкага Саюза. Значыцца, варожыя акты ў адносінах Савецкага Саюза з боку Англіі і Францыі аб'ясняюцца не гандлем СССР з Германіяй, а тым, што ў англа-французскіх правячых кругоў сарваліся разлікі наконт скарыстання нашай краіны ў вайне супроць Германіі і яны, з гэтай прычыны, праводзяць палітыку помсты ў адносінах Савецкага Саюза.

Неабходна дадаць, што ўсе гэтыя варожыя дзеянні з боку Англіі і Францыі праводзіліся, не гледзячы на тое, што Савецкі Саюз не прадпрымаў да гэтага часу ніякіх недружалюбных дзеянняў у адносінах гэтых краін. Прыпісваемыя Савецкаму Саюзу фантастычныя планы нейкіх паходаў Чырвонай Арміі «на Індыю», «на Усход» і т. п. — такая відавочная дзікасць, што падобнай бязглуздай брахні могуць верыць толькі людзі, зусім выжыўшыя з розуму. **(Смех).** Справа, зразумела, не ў гэтым. Справа, відавочна, у тым, што палітыка нейтралітэта, праводзімая Савецкім Саюзам, прышлася не па густу англа-французскім правячым кругам. Да таго-ж нервы ў іх, відаць, не зусім у парадку. **(Смех).** Яны хочуць навязаць нам іншую палітыку — палітыку варожасці і вайны з Германіяй, палітыку, якая дала-б ім магчымасць скарыстаць СССР у імперыялістычных мэтах. Час'бы гэтым панам зразумець, што Савецкі Саюз не быў і ніколі не будзе зброяй чужой палітыкі, што СССР заўсёды праводзіў і будзе праводзіць сваю ўласную палітыку, не лічачыся з тым, падабаецца гэта панам з іншых краін альбо не падабаецца. **(Бурныя, працяглыя апладысменты).**

Пераходжу да фінляндскага пытання.

У чым сэнс вайны, разгарнуўшайся ў Фінляндыі на працягу апошніх трох з лішнім месяцаў? Вы ведаеце, што сэнс гэтых падзей заключаўся ў забеспячэнні бяспекі паўночна-заходніх граніц Савецкага Саюза і, перш за ўсё, у забеспячэнні бяспекі Ленінграда.

На працягу кастрычніка і лістапада месяцаў мінулага года савецкім урадам вяліся перагаворы з фінляндскім урадам аб прапановах, ажыццяўленне якіх у сучаснай, усё больш накаляючайся міжнароднай абстаноўцы, мы лічылі зусім неабходным і неадкладным для забеспячэння безапаснасці краіны і, асабліва, для безапаснасці Ленінграда. З гэтых перагавораў нічога не выйшла, з прычыны занятай фінляндскімі прадстаўнікамі недружалюбнай пазіцыі. Рашэнне пытання перайшло на палі вайны. Можна з упэўненасцю сказаць, што калі'б у адносінах Фінляндыі не было знешніх уплываў, калі-б у адносінах Фінляндыі было менш падтрымання да варожай Савецкаму Саюзу палітыкі з боку некаторых трэціх дзяржаў, то Савецкі Саюз і Фінляндыя ўжо восенню мінулага года мірна дамовіліся-б паміж сабой і справа абышлася-б без вайны. Але, не гледзячы на тое, што свае пажаданні савецкі ўрад звёў да мінімума, справу не ўдалося скончыць дыпламатычным шляхам.

Цяпер, калі ваенныя дзеянні ў Фінляндыі закончыліся і падпісан Мірны Дагавор паміж СССР і Фінляндскай Рэспублікай, трэба і можна меркаваць аб значэнні вайны ў Фінляндыі на падставе неаспрэчных фактаў. А гэтыя факты гавораць самі за сябе. Гэтыя факты гавораць аб тым, што блізка ад Ленінграда, на ўсім Карэльскім перашыйку, паглыбляючыся на 50—60 кілометраў, фінляндскія ўлады пабудавалі шматлікія і магутныя жалезабетонныя і гранітна-земляныя ваенныя ўмацаванні з артылерыяй і кулямётамі. Лік гэтых умацаванняў вылічваецца многімі сотнямі. Гэтыя ваенныя ўмацаванні, асабліва жалезабетонныя збудаванні, дасягнуўшыя значнай ваеннай магутнасці, мешчыя падземныя злучэнні, акружаныя спецыяльнымі проціўтанкавымі ровамі і надаўбамі з граніту і патрульляемыя ўстройствамі шматлікіх мінных палёў, разам складалі так званую «лінію Манергейма», пабудаваную пад кіраўніцтвам адпаведных іншаземных спецыялістаў па тыпу «лініі Мажыно» і «лініі Зігфрыда». Трэба адзначыць, што гэтыя ўмацаванні лічыліся да нашых дзён непрыступнымі, гэта значыць такімі ўмацаваннямі, якія да гэтага часу яшчэ ні адной арміяй не былі сакрушаны. Трэба таксама адзначыць, што кожную вёсачку ў гэтых раёнах фінскія ваенныя ўлады загадзя стараліся ператварыць ва ўмацаваны пункт, снабжоны зброяй, радыёантэнамі, балонкамі для гаручага і т. п. У многіх месцах у паўднёвай і ўсходняй Фінляндыі шчыльна да нашай граніцы былі праведзены стратэгічныя чыгуначныя пуці і шасейныя дарогі, якія не маюць ніякага гаспадарчага значэння.

Коратка гаворачы, ваенныя дзеянні ў Фінляндыі паказалі, што Фінляндыя і, перш за ўсё, Карэльскі перашэек, была ўжо к 1939 году ператворана ў гатовы ваенны плацдарм для трэціх дзяржаў для нападу на Савецкі Саюз, для нападу на Ленінград.

Неаспрачныя факты паказалі, што варожасць фінляндскай палітыкі, з якой мы сутыкнуліся восенню мінулага года, была не выпадковай. Варожыя Савецкаму Саюзу сілы падрыхтавалі супроць нашай краіны і, перш за ўсё, супроць Ленінграда такі ваенны плацдарм у Фінляндыі, які пры пэўных, неспрыяльных для СССР знешніх акалічнасцях павінен быў адыграць сваю ролю ў планах антысавецкіх сіл імперыялістаў і іх саюзнікаў у Фінляндыі.

Чырвоная Армія не толькі сакрушыла «лінію Манергейма» і тым пакрыла сябе славай, як першая армія, у найцяжэйшых умовах пракладаўшая шлях праз вялікую магутную паласу ўпаўне сучасных ваенных умацаванняў. — Чырвоная Армія разам з Чырвоным Флотам не толькі сакрушыла фінляндскі ваенны плацдарм, падрыхтаваны для нападу на Ленінград, але і ліквідавала сякія-такія антысавецкія планы, выпеставаныя на працягу апошніх год некаторымі трэцімі краінамі. **(Працяглыя апладысменты).**

Наколькі далёка зайшла варожасць да нашай краіны ў правячых і ваенных кругах Фінляндыі, падрыхтоўваўшых ваенны плацдарм супроць СССР, відаць таксама з шматлікіх фактаў выключнага варварства і зверства з боку белафінаў у адносінах раненых і папаўшых у палон чырвонаармейцаў. Так, калі ў адным з раёнаў на поўнач ад Ладажскага возера фіны акружылі нашы санітарныя землянкі, дзе знаходзілася 120 цяжкараненых, усе яны былі знішчаны белафінамі, частка іх спалена, частка знойдзена з разбітымі галовамі, астатнія заколаты альбо прыстрэлены. Не гледзячы на наяўнасць смяротных ран, значная частка загінуўшых тут, як і ў іншых месцах, мела сляды прыстрэлаў у галаву і дабівання прыкладамі, а частка забітых агнястрэльнай зброяй мела нажавыя раны, нанесеныя фінкамі ў твар. Некаторыя трупы былі знойдзены з адрубленымі галовамі і галовы не былі знойдзены. У адносінах трапіўшых у рукі белафінаў жанчын-санітарак ужываліся спецыяльныя здзекі і неймаверныя зверствы. У некаторых выпадках трупы забітых прыстаўляліся да дрэва дагары нагамі. Усё гэта варварства і бязлічныя зверствы — плады палітыкі фінляндскай белагвардзейшчыны, якая імкнулася раздуць у сваім народзе ненавісць да нашай краіны.

Так выглядае твар фінскіх абаронцаў «заходняй цывілізацыі».

Не цяжка бачыць, што вайна ў Фінляндыі была не проста сутычкай з фінскімі войскамі. Не. Тут справа абстаяла складаней. Тут адбылася сутычка нашых войск не проста з фінскімі войскамі, а са злучанымі сіламі імперыялістаў раду краін, уключаючы англійскіх, французскіх і іншых, якія дапамагалі фінляндскай буржуазіі ўсімі відамі зброі і, асабліва, артылерыяй і самалётамі, а таксама сваімі людзьмі пад выглядам «добраахвотнікаў», сваім золатам і ўсякім снабжэннем, сваёй шалёнай агітацыяй ва ўсім свеце за ўсялякае разгаранне вайны супроць Савецкага Саюза. Да гэтага трэба дадаць, што ў лютым выцці ворагаў Савецкага Саюза ўвесь час выдзяляліся візглівыя галасы ўсіх гэтых прастытуіраваных «сацыялістаў» з ІІ Інтэрнацыянала **(Вясёлае ажыўленне ў зале)**, усіх гэтых Этлі і Блюмаў, Сітрынаў і Жуо, Трэнмелей і Хеглундаў — лакеяў капітала, канчаткова прадаўшых сябе паліпальнічым ваям.

Англійскі прэм'ер Чэмберлен, выступаючы 19 сакавіка ў палаце абшчын, не толькі выразіў зло жаль у сувязі з тым, што не ўдалося перашкодзіць спыненню вайны ў Фінляндыі, перад усім светам вывернуўшы, тым самым, наізнанку сваю «міралюбівую» імперыялістычную душу **(Смех)**, але і даў нешта накшталт справаздачы ў тым, як і чым іменна англійская імперыялісты імкнуліся дапамагчы распальванню вайны ў Фінляндыі супроць Савецкага Саюза. Чэмберлен агласіў спісак ваенных матэрыялаў, якія былі абяцаны і адпраўлены ў Фінляндыю: было абяцана 152 самалёты, паслана—101 самалёт; было абяцана гармат—223, паслана—114; было абяцана снарадаў — 297 тысяч, паслана — 185 тысяч; гармат Вікерса было абяцана — 100, паслан — 100; было абяцана авіяцыйных бомб — 20.700, было паслана — 15.700; было абяцана процітанкавых мін — 20 тысяч, было паслана — 10.000 і т. д. Не саромячыся, Чэмберлен расказваў і аб тым, што «падрыхтоўка да адпраўкі экспедыцыйных часцей вялася з максімальнай шпаркасцю, і экспедыцыйная армія ў колькасці 100 тысяч чалавек была гатова да адпраўкі ў пачатку сакавіка — за два месяцы да таго тэрміну, які назначыў Манергейм для іх прыбыцця ў Фінляндыю... Гэтыя войскі не павінны былі быць апошнімі».

Вось як выглядае на справе «міралюбівы» англійскі імперыялізм на сваіх-жа ўласных прызнаннях.

Што датычыць Францыі, то, па паведамленнях французскага друку, адтуль было накіравана ў Фінляндыю 179 самалётаў, 472 гарматы, 795 тысяч снарадаў, 5.100 кулямётаў, 200.000 ручных гранат і т. д. 11 сакавіка тагочасны французскі прэм'ер Даладз'е заявіў у палаце дэпутатаў, што «Францыя выступіла на чале краін, якія згадзіліся пастаўляць ваенныя матэрыялы Фінляндыі і, у прыватнасці, Францыя, па просьбе Гельсінкі, толькі што паслала ў Фінляндыю ўльтрасучасныя бамбардыроўшчыкі». Даладз'е заявіў, што «з 26 лютага экспедыцыйны корпус французскіх войск снаражон і падрыхтаван. Значная колькасць суднаў гатова адправіцца з двух вялікіх партоў Ламанша і Атлантычнага ўзбярэжжа». Даладз'е заявіў таксама, што саюзнікі «прыйшлі на дапамогу Фінляндыі ўсімі абяцанымі сіламі».

Гэтыя варожыя Савецкаму Саюзу заявы Даладз'е гавораць самі за сябе. Аднак, няма патрэбы спыняцца на гэтых варожых заявах, паколькі ў іх, відаць, няма ўжо ў поўнай меры разумення ходу мыслей. **(Вясёлае ажыўленне ў зале).**

Трэба яшчэ ўпамянуць аб удзеле ў фінляндскай вайне Швецыі. Паводле паведамленняў абыякоўных усе шведскія газеты, Швецыя прадаставіла ў распараджэнне Фінляндыі ў часе вайны супроць Савецкага Саюза «вядомую колькасць самалётаў, якія склалі, прыблізна, 1/5 частку ўсіх тагочасных шведскіх ваенна-паветраных сіл». Па заяве шведскага ваеннага міністра фіны атрымалі са Швецыі 84.000 вінтовак, 575 кулямётаў, звыш 300 артылерыйскіх гармат, 300 тысяч гранат, 50 мільёнаў патронаў. Увесь гэты матэрыял, паводле заявы міністра, быў самага навейшага ўзору.

Не адстала ў раздуванні вайны ў Фінляндыі таксама і Італія. Яна, напрыклад, паслала ў Фінляндыю 50 ваенных самалётаў. Ваенная дапамога Фінляндыі ішла таксама з гэтак адданых «міралюбію» Злучаных Штатаў Амерыкі **(Агульны смех).**

Агульная колькасць усякага ўзбраення, пасланага ў Фінляндыю з іншых краін толькі за час вайны, дасягнула, па няпоўных вестках: самалётаў — не менш 350, артылерыйскіх гармат да 1.500, звыш 6.000 кулямётаў, да 100 тысяч вінтовак, 650.000 ручных гранат, 2.500.000 снарадаў, 160 мільёнаў патронаў і шмат многае іншае.

Няма патрэбы прыводзіць іншыя факты, пацвярджаючыя, што ў Фінляндыі справа ішла не проста аб нашай сутычцы з фінскімі войскамі, а аб сутычцы са злучанымі сіламі раду найбольш варожых Савецкаму Саюзу імперыялістычных краін.

Зламіўшы гэтыя злучаныя сілы ворагаў, Чырвоная Армія і Чырвоны Флот упісалі новую слаўную старонку ў сваю гісторыю і паказалі, што ў нашым народзе крыніца адвагі, самаадданасці і гераізма невычарпальна. **(Бурныя апладысменты).**

Вайна ў Фінляндыі патрабавала, як ад нас, так і ад фінаў вялікіх ахвяр. Па падліках нашага Генеральнага Штаба на нашай старане колькасць забітых і памёршых ад ран складае 48.745 чалавек, г. зн. нямногім менш 49 тысяч чалавек, колькасць раненых — 158.863 чалавекі. З фінскай стараны робяцца спробы прыменшыць іх ахвяры, але ахвяры фінаў значна больш нашых. На мінімальных падліках нашага Генеральнага Штаба ў фінаў колькасць забітых дасягае не менш 60 тысяч, не лічачы памёршых ад ран, а колькасць раненых не менш 250 тыс. чалавек. Такім чынам, выходзячы з таго, што колькасць фінскай арміі складала не менш 600 тысяч чалавек, трэба прызнаць, што фінская армія страціла забітымі і раненымі больш палавіны свайго саставу.

Такія факты.

Застаецца пытанне, чаму ўсё-ж правячыя кругі Англіі і Францыі, а таксама некаторых іншых краін так актыўна ўдзельнічалі ў гэтай вайне на старане Фінляндыі, супроць Савецкага Саюза. Вядома, што ўрады Англіі і Францыі прымалі адчайныя намаганні, каб перашкодзіць сканчэнню вайны і аднаўленню міру ў Фінляндыі, хаця яны не звязаны ніякімі абавязацельствамі ў адносінах да Фінляндыі. Вядома таксама, што ў свой час нават пры наяўнасці пакта ўзаемадапамогі паміж Францыяй і Чэха-Славакіяй, Францыя не прышла на дапамогу Чэха-Славакіі. А Фінляндыі проста навязвалі сваю ваенную дапамогу як Францыя, так і Англія, каб толькі перашкодзіць сканчэнню вайны і аднаўленню міру паміж Фінляндыяй і Савецкім Саюзам.

Наёмныя разбойнікі пяра — з ліку ўсякіх пісьменнікаў, спецыялізаваўшыхся на газетным жульніцтве і шантажы, спрабуюць аб'ясніць падобныя паводзіны англа-французскай буржуазіі «клопатамі» аб «малых народах». Але аб'ясніць гэтую палітыку Англіі і Францыі асаблівымі клопатамі аб інтарэсах малой дзяржавы проста смешна. Аб'ясніць яе абавязацельствамі перад Лігай нацый, якая патрабавала, маўляў, абароны яе члена, — таксама зусім неаструмна. На самой справе, не прайшло яшчэ і года, як Італія захапіла і знішчыла незалежную Албанію, якая састаяла членам Лігі Нацый. І што-ж? Ці выступілі Англія і Францыя ў абарону Албаніі, ці ўзнялі яны хаця-б слабы голас супроць захватніцкіх дзеянняў Італіі, насільна падпарадкаваўшай сабе Албанію, не лічачыся з яе насельніцтвам, складаючым звыш мільёна чалавек, і не звяртаючы ўвагі на тое, што Албанія — член Лігі Нацый? Не, ні англійскі, ні французскі ўрад, ні Злучаныя Штаты Амерыкі, ні Ліга Нацый, якая страціла ўсякі аўтарытэт з-за гаспадарання тут усё тых-жа англа-французскіх імперыялістаў, нават не паварушылі пальцам з гэтага выпадку. Гэтыя «абаронцы» малых народаў, гэтыя «паборнікі» правоў членаў Лігі Нацый на працягу цэлых 12 месяцаў так і не рашыліся паставіць на абмеркаванне Лігі Нацый пытанне аб захвале Албаніі Італіяй, праведзеным яшчэ ў красавіку мінулага года. Больш таго, яны фактычна санкцыяніравалі гэты захват. Значыць, зусім не абаронай малых народаў і не абаронай правоў членаў Лігі Нацый аб'ясняецца падтрыманне Фінляндыі супроць Савецкага Саюза з боку англійскіх і французскіх правячых кругоў. Гэтае падтрыманне аб'ясняецца тым, што ў Фінляндыі ў іх быў гатовы ваенны плацдарм на выпадак нападу на СССР, а Албанія не займала такога месца ў іх планах. На самой справе, правы і інтарэсы малых народаў прадстаўляюць разменную манету ў руках імперыялістаў.

Кіруючая газета англійскіх імперыялістаў «Таймс», як і кіруючая газета французскіх імперыялістаў «Тан», не гаворачы ўжо аб іншых англійскіх і французскіх буржуазных газетах, у апошнія месяцы адкрыта заклікалі да інтэрвенцыі супроць Савецкага Саюза, не лічачыся з тым, што паміж Англіяй і Францыяй, з аднаго боку, і Савецкім Саюзам, з другога боку, існуюць, так званыя, нармальныя дыпламатычныя адносіны. У тон гэтым кіруючым буржуазным газетам, і нават забягаючы ўперад, выступаюць з прамовамі людзі з лакейскай, абстаноўкай зараз у кожнай «парадачнай» буржуазнай дзяржаве, для «сацыялістаў» тыпу Этлі ў Англіі, тыпу Блюма ва Францыі, якія так стараюцца наконт разгарання і далейшага расшырэння вайны. У выступленнях англа-французскай імперыялістычнай прэсы і гэтых «сацыялістычных» яе падгалоскаў чуецца голас таго-ж азвярэлага імперыялізма, ненавідзячага сацыялістычную дзяржаву, які нам знаём з першых дзён існавання Савецкага Саюза. Яшчэ 17 красавіка 1919 года англійскі «Таймс» пісаў:

«Калі мы паглядзім на карту, то мы знойдзем, што лепшым подступам да Петраграда з'яўляецца Балтыка і што найкарацейшы і найбольш лёгкі шлях да яго ляжыць праз Фінляндыю, граніцы якой знаходзяцца ўсяго ў якіх-небудзь 30 мілях ад сталіцы Расіі. Фінляндыя — гэта ключ да Петраграда, а Петраград — гэта ключ да Масквы».

Калі патрэбны былі якія-небудзь доказы таго, што англійскія і французскія імперыялісты не расталіся за гэтага часу з такога роду сумасброднымі планамі, то пасля апошніх падзей у Фінляндыі ўсякія няяснасці на гэты конт знікнулі. Адпаведныя планы зноў сарваліся не па недахопу стараннасці антысавецкіх сіл у Англіі і Францыі і не проста таму, што ў апошні момант кіруючыя кругі Фінляндыі, а таксама Швецыі і Нарвегіі, праявілі, нарэшце, пэўную разважлівасць. Гэтыя планы сарваліся вынікам бліскучых поспехаў Чырвонай Арміі, асабліва, на Карэльскім перашыйку. **(Апладысменты).** Але мы не забудзем, што апошнія падзеі зноў напомнілі ўсім нам аб неабходнасці далейшага няўхільнага ўмацавання магутнасці нашай Чырвонай Арміі і ўсёй абароны нашай краіны. **(Шумныя і працяглыя апладысменты).**

У пачатку лютага фінамі было практычна пастаўлена пытанне аб скананні вайны ў Фінляндыі. Праз шведскі ўрад мы даведаліся, што фінляндскі ўрад хацеў-бы ведаць аб нашых умовах, на якіх можна скончыць вайну. Раней, чым рашыць гэтае пытанне, мы звярнуліся да Народнага Урада Фінляндыі, каб даведацца яго думкі па гэтаму пытанню. Народны Урад выказаўся за тое, каб, у мэтах спынення кровапраліцця і палягчэння становішча фінляндскага народа, варта было-б пайсці насустрач прапанове аб скананні вайны. Тады намі былі высунуты ўмовы, якія хутка былі прыняты фінляндскім урадам. Я павінен дадаць, што праз тыдзень пасля пачатку перагавораў з фінамі з боку англійскага ўраду было таксама выражана жаданне высветліць магчымасць пасрэдніцтва нібы ў мэтах скачання вайны ў Фінляндыі **(Смех)**, але калі наш паўпрэд у Англіі т. Майскі інфармаваў Лондан аб нашых умовах, потым пазней прынятых Фінляндыяй, то англійскі ўрад не захацеў садзейнічаць скачанню вайны і аднаўленню міру паміж СССР і Фінляндыяй. Тым не менш, пагадненне паміж СССР і Фінляндыяй хутка адбылося. Рэзультаты пагаднення аб спыненні ваенных дзеянняў і аб устанаўленні міру дадзены ў Мірным Дагаворы, падпісаным 12 сакавіка. У сувязі з гэтым паўстала пытанне аб самароспуску Народнага Урада, што ім і было ажыццёўлена.

Вы ведаеце ўмовы, устаноўленыя Мірным Дагаворам. Згодна гэтаму Дагавору праведзена змяненне паўднёвай і часткова ўсходняй граніц Фінляндыі. Увесь Карэльскі перашэек, разам з Выбаргам і Выбаргскім залівам, усё заходняе і паўночнае ўзбярэжжа Ладажскага возера, разам з Кексгольмам і Сартавала, перайшлі да Савецкага Саюза. У раёне Кандалакшы, дзе граніца Фінляндыі асабліва блізка падыходзіла да Мурманскай чыгункі, праведзена адсоўванне граніцы. Да Савецкага Саюза адышлі належаўшыя Фінляндыі невялікія часткі паўастравоў Сярэдні і Рыбачы — на поўначы, а ў Фінскім заліве пэўная група астравоў, разам з востравам Гогланд. Апрача таго, тэрмінам на 30 год да Савецкага Саюза, у парадку арэнды, са штогодняй уплатай Савецкім Саюзам 8 мільёнаў фінскіх марак, перайшоў паўвостраў Ханко з прылягаючымі да яго астравамі, дзе будзе збудавана наша ваенна-марская база для абароны ад агрэсіі ўваходу ў Фінскі заліў. Дагавор, апрача таго, палягчае магчымасць транзіту тавараў для Швецыі, Нарвегіі і Савецкага Саюза. Разам з тым, Мірны Дагавор прадугледжвае ўзаемнае ўстрыманне ад усякага нападу адзін на аднаго і неўдзел у варожых адна другой кааліцыях.

У англа-французскай прэсе рабіліся спробы паказаць савецка-фінляндскі дагавор і, у прыватнасці, пераход Карэльскага перашыйка да Савецкага Саюза, як «знішчэнне» незалежнасці Фінляндыі. Гэта, зразумела, дзікасць і пустая брахня! Фінляндыя прадстаўляе і цяпер тэрыторыю амаль у чатыры разы большую, чым Венгрыя, у восем з лішнім разоў большую, чым Швейцарыя. Калі ніхто не

(Працяг гл. на 2 стар.).

Шостая Сесія Вярхоўнага Совета СССР 1-га склікання

ДАКЛАД АБ ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫЦЫ ЎРАДА

Старшыні Совета Народных Камісараў і Народнага Камісара Замежных Спраў тав. В. М. МОЛАТАВА на пасяджэнні Вярхоўнага Совета Саюза ССР 29 сакавіка 1940 г.

(ПРАЦЯГ)

сумнявацца ў тым, што Венгрыя і Швейцарыя з'яўляюцца незалежнымі дзяржавамі, як можна сумнявацца ў тым, што Фінляндыя з'яўляецца незалежнай і суверэннай?

У той-жа англа-французскай прэсе пісалі, што Совецкі Саюз нібы хочаператварыць Фінляндыю ўсяго толькі ў балтыйскую дзяржаву. Зразумела, і гэта глупства. Дастаткова ўказаць на тое, што СССР, заняўшы у часе вайны прылягаючы да Ледавітага акіяна раён Петсамо, добраахвотна зноў вярнуў гэты раён Фінляндыі, бо лічыў неабходным прадаставіць Фінляндыі незамярзаючы акіянскі порт. З гэтага вынікае, што мы лічым Фінляндыю не толькі балтыйскай, але і паўночнай краінай.

Праўда заключаецца не ў гэтых вымыслах англа-французскіх газет, якія набілі руку на ўсякіх фальшыўках антысовецкай прапаганды. Праўда заключаецца ў іншым, а іменна ў тым, што Совецкі Саюз, разбіўшы фінскую армію і меўшы поўную магчымасць заняць усю Фінляндыю, не пайшоў на гэта і не патрабаваў ніякай кантрыбуцыі ў пакрыццё сваіх ваенных расходаў, як гэта зрабіла-б усякая другая дзяржава, а абмежаваў свае пажаданні мінімумам, праявіўшы велікадушнасць у адносінах Фінляндыі.

У чым асноўны сэнс Мірнага Дагавора? У тым, што ён належным чынам забяспечвае безапаснасць Ленінграда, а таксама Мурманска і Мурманскай чыгункі. На гэты раз мы не маглі абмежавацца толькі тымі пажаданнямі, якія намі былі высунуты восенню мінулага года і прыняцце якіх Фінляндыяй азначала-б уніканне вайны. Пасля таго, як пралілася — не па нашай віне — кроў нашых байцоў і мы пераканаліся, наколькі далёка зайшла варожасць палітыкі фінляндскага ўрада ў адносінах Совецкага Саюза, мы павінны былі пытанне аб безапаснасці Ленінграда паставіць на больш надзейную аснову і, апрача таго, павінны былі паставіць пытанне аб безапаснасці Мурманскай чыгункі і Мурманска, які з'яўляецца адзіным нашым незамярзаючым акіянскім портам на захадзе і таму мае выключна вялікае значэнне для нашага знешняга гандлю і наогул для сувязі Совецкага Саюза з іншымі краінамі. Ніякіх іншых мэт, апрача забеспячэння безапаснасці Ленінграда, Мурманска і Мурманскай чыгункі, мы не ставілі ў Мірным Дагаворы. Але затое гэтую задачу мы лічылі неабходным рашыць надзейным, трывалым чынам. Мірны Дагавор выходзіць з прызнання прынцыпа дзяржаўнай незалежнасці Фінляндыі, з прызнання самастойнасці яе знешняй і ўнутранай палітыкі і, разам з тым, з неабходнасці забеспячэння безапаснасці Ленінграда і паўночна-заходніх граніц Совецкага Саюза.

Такім чынам, мэта, пастаўленая намі, дасягнута, і мы можам выразіць поўнае задавальненне дагаворам з Фінляндыяй. **(Апладысменты).**

Ад гэтага часу палітычныя і гаспадарчыя адносіны з Фінляндыяй поўнасцю аднаўляюцца. Урад выражае ўпэўненасць, што паміж Совецкім Саюзам і Фінляндыяй будуць развівацца нармальныя добрасуседскія адносіны.

Трэба, аднак, папярэдзіць супроць спроб парушэння толькі што заключанага Мірнага Дагавора, якія ўжо робяцца з боку некаторых кругоў Фінляндыі, а таксама Швецыі і Нарвегіі пад выглядам стварэння ваенна-абарончага саюза паміж імі. У святле нядаўняй прамовы старшыні нарвежскага стортынга п. Хамбро, заклікаўшага Фінляндыю, са спасылкамі на гістарычныя прыклады, «да адваявання граніц краіны», і заяўляўшага, што такі мір, які заключан Фінляндыяй з СССР, «не можа існаваць доўга»,—у святле гэтага і падобных выступленняў не цяжка зразумець, што спробы стварэння так званага «абарончага саюза» Фінляндыі, Швецыі і Нарвегіі накіраваны супроць СССР і безрассудна падаграваюцца ідэалогіяй ваеннага рэванша. Стварэнне такога ваеннага саюза з удзелам Фінляндыі не толькі супярэчыла-б артыкулу 3-му Мірнага Дагавора, выключаючага ўдзел дагаварваючыхся старон у варожых адзін аднаму кааліцыях (саюзах), але і супярэчыла-б усяму Мірнаму Дагавору, моцна вызначыўшаму совецка-фінляндскую граніцу. Вернасць гэтаму Дагавору несумяшчальна з удзелам Фінляндыі ў якім-небудзь ваенна-рэваншысцкім саюзе супроць СССР. Удзел-жа Швецыі і Нарвегіі ў такім саюзе азначаў-бы адмаўленне гэтых краін ад праводзімай імі палітыкі нейтралітэта і пераход іх да новай знешняй палітыкі, з чаго Совецкі Саюз не мог-бы не зрабіць сваіх адпаведных вывадаў.

У сваю чаргу ўрад лічыць, што ў Совецкага Саюза няма спрэчных пытанняў са Швецыяй і Нарвегіяй і што совецка-шведскія і совецка-нарвежскія адносіны павінны развівацца на аснове дружбы. Распаўсюджваўшыяся-ж у антысовецкіх мэтах чуткі аб тым, што Совецкі Саюз нібы патрабуе портаў на заходнім узбярэжжы Скандынавіі, што ён прэтэндуе на Нарвік і т. п., — такая дзікасць, што гэта не мае патрэбы ў абвяржэнні. Стараннi-ж паноў «соцыялістаў», накшталт Хеглунда ў Швецыі і Транмеля ў Нарвегіі, псаваць адносіны гэтых краін з Совецкім Саюзам трэба залічыць як справу злейшых ворагаў рабочага класа, купленых іншакраіннымі капіталістамі і здраджваючых інтарэсы свайго народа.

Заключэнне Мірнага Дагавора з Фінляндыяй завяршае выкананне задачы, пастаўленай у мінулым годзе, па забеспячэнню безапаснасці Совецкага Саюза з боку Балтыйскага мора. Гэты Дагавор з'яўляецца неабходным дадаткам да трох дагавораў аб узаемадапамозе, заключаных з Эстоніяй, Латвіяй і Літвой. На падставе поўгадовага вопыту, прайшоўшага з часу заключэння гэтых дагавораў аб узаемадапамозе, можна зрабіць упаўне вызначаныя станоўчыя вывады аб дагаворах з Прыбалтамі. Трэба прызнаць, што дагаворы Совецкага Саюза з Эстоніяй, Латвіяй і Літвой садзейнічалі ўмацаванню міжнародных пазіцый як Совецкага Саюза, так і Эстоніі, Латвіі і Літвы. Наперакор запалохванням, якімі займаліся варожыя Совецкаму Саюзу імперыялістычныя кругі, дзяржаўная незалежнасць і самастойнасць палітыкі Эстоніі, Латвіі і Літвы ні ў чым не пацярпелі, а гаспадарчыя адносіны гэтых краін з Совецкім Саюзам сталі прыкметна пашырацца. Выкананне дагавораў з Эстоніяй, Латвіяй і Літвой праходзіць здавальняюча і стварае прадпасылкі для далейшага паляпшэння адносін паміж Совецкім Саюзам і гэтымі дзяржавамі.

У апошні час у замежным друку выключна вялікая ўвага ўдзялялася пытанню аб узаемаадносінах Совецкага Саюза з яго суседзямі па паўднёвай граніцы, у прыватнасці па Закаўказзю, а таксама з Румыніяй. Ці трэба даказваць, што ўрад не бачыць ніякіх падстаў да пагоршання адносін з нашымі суседзямі і на поўдні. Праўда, зараз у Сірыі і наогул на Бліжнім Усходзе ідзе вялікая падазроная капашня са стварэннем англа-французскіх, пераважна каланіяльных армій на чале з генералам Вейганам. Мы павінны быць пільнымі ў адносінах спроб скарыстання гэтых каланіяльных і некаланіяльных войск у варожых Совецкаму Саюзу мэтах. Усякія спробы такога роду выклікалі-б з нашага боку адказныя меры супроць агрэсараў, прычым небяспека такой ігры з агнём павінна быць зусім відавочнай для варожых СССР дзяржаў і для тых з нашых суседзяў, хто акажацца зброяй гэтай агрэсіўнай палітыкі супроць СССР. **(Апладысменты).** Што-ж датычыць нашых адносін з Турцыяй і Іранам, то яны вызначаюцца існуючымі паміж намі дагаворамі аб ненападзе і няўхільным імкненнем Совецкага Саюза да выканання выцякаючых з гэтага ўзаемных абавязацельстваў. Нашы адносіны з Іранам у гаспадарчай галіне ўрэгуліраваны толькі што заключаным Совецка-Іранскім гандлёвым дагаворам.

З упамянутых мной паўднёвых суседніх дзяржаў у нас няма пакта ненападу з Румыніяй. Гэта аб'ясняецца наяўнасцю нявырашанага спрэчнага пытання, пытання аб Бесарабіі, захват якой Румыніяй Совецкі Саюз ніколі не прызнаваў, хаця і ніколі не ставіў пытання аб звароце Бесарабіі ваенным шляхам. Таму няма ніякіх падстаў да якога-небудзь пагоршання і Совецка-Румынскіх адносін. Праўда, у нас на працягу доўгага часу няма паўнамоцнага прадстаўніка ў Румыніі і яго абавязкі выконвае паверанаы ў справах. Але гэта выклікана спецыфічнымі акалічнасцямі нядаўняга мінулага. Калі закрануць гэтае пытанне, то прыходзіцца напомніць наконт непрыстойнай ролі румынскіх улад у 1938 г. у адносінах выконваўшага ў той час абавязкі совецкага паўпрэда ў Румыніі—Бутэнка. Як вядома, гэты апошні нейкім чынам таямніча тады знік не толькі з паўпрэдства, але і з Румыніі, і совецкаму ўраду так і не ўдалося нічога пэўнага ўстанавіць аб гэтым зніканні, прычым мы нібыта павінны паверыць, што ніякія румынскія ўлады не мелі адносін да гэтай скандальна-злачыннай справы. Няма чаго гаварыць, што ў цывілізаванай дзяржаве, і наогул у колькі-небудзь упарадкаванай краіне, такім рэчам не павінна быць месца. Пасля гэтага зразумела адбыўшаяся заціжка з назначэннем совецкага паўпрэда ў Румынію. Трэба, аднак, думаць, што Румынія зразумее, што падобныя рэчы нецярпімы.

У нашых адносінах з Японіяй мы не без вядомых цяжкасцей, але ўсё-ж вырашылі некаторыя пытанні. Аб гэтым гаворыць заключанае 31 снежня мінулага года совецка-японскае пагадненне па рыбалоўнаму пытанню на бягучы год, а таксама згода Японіі на ўплату апошняга, доўга затрымліваўшагася ёю, грашовага ўзносу за КУЧ. Тым не менш, нельга выразіць вялікага задаволення нашымі адносінамі з Японіяй. Так, да гэтага часу, не гледзячы на адбываўшыяся працяглыя перагаворы совецка-мангольскіх і япона-манчжурскіх дэлегатаў, засталося нявырашаным важнае пытанне аб устанаўленні граніцы на частцы тэрыторыі ў раёне быўшага ў мінулым годзе ваеннага канфлікта. Японскімі ўладамі працягваюць чыніцца перашкоды к нармальнаму скарыстанню ўнесенага Японіяй апошняга грашовага ўзносу за КУЧ. Зусім ненармальны ў многіх выпадках адносіны японскіх улад да супрацоўнікаў совецкіх органаў у Японіі і Манчжурыі. У Японіі павінны, нарэшце, зразумець, што Совецкі Саюз ні ў якім разе не дапусціць парушэння яго інтарэсаў. **(Працяглыя апладысменты).** Толькі пры такім разуменні совецка-японскіх адносін яны могуць развівацца здавальняюча.

У сувязі з Японіяй, скажу два словы па аднаму, так сказаць, не дзелавому пытанню **(вясёлае ажыўленне ў зале).** Гэтымі днямі адзін з дэпутатаў японскага парламента задаў свайму ўраду такое пытанне: «Ці не належыць прадумаць, як карэнным чынам пакончыць з канфліктамі паміж СССР і Японіяй, напрыклад, шляхам пакупкі Прымор'я і іншых тэрыторый». **(Узрыў смеху).** Задаўшы гэтае пытанне японскі дэпутат, цікавячыйся пакупкай совецкіх тэрыторый, якія не прадаюцца **(смех),** па меншай меры, вясёлы чалавек. **(Смех, апладысменты).** Але сваімі глупымі пытаннямі ён, па-мойму, не ўзнімае аўтарытэту свайго парламента. **(Смех).** Аднак, калі ў японскім парламенце так моцна захапляюцца гандлем, ці не заняцца дэпутатам гэтага парламента продажам паўднёвага Сахаліна. **(Смех, працяглыя апладысменты).** Я не сумняваюся, што ў СССР знайшліся-б пакупнікі. **(Смех, апладысменты).**

Што датычыць нашых адносін са Злучанымі Штатамі Амерыкі, то яны за апошні час не палепшыліся і, бадай, не пагоршыліся, калі не лічыць так званага «маральнага эмбарго» супроць СССР, пазбаўленага якога-небудзь сэнсу, асабліва пасля заключэння міру паміж СССР і Фінляндыяй. Наш імпарт з ЗША павялічыўся ў параўнанні з мінулым годам. Ён мог-бы яшчэ больш павялічыцца, калі-б амерыканскія ўлады не чынілі перашкод.

Гэткая ў цэлым міжнародная абстаноўка ў сувязі з падзеямі за перыяд апошніх пяці месяцаў.

З усяго сказанага вышэй відаць, у чым мы бачым галоўныя задачы нашай знешняй палітыкі ў данай міжнароднай абстаноўцы.

Коратка гаворачы, задачы нашай знешняй палітыкі заключаюцца ў тым, каб забяспечыць мір паміж народамі і безапаснасць нашай краіны. Вывадам з гэтага з'яўляецца—пазіцыя нейтралітэта і няўдзел у вайне паміж буйнейшымі дзяржавамі Еўропы. Гэта пазіцыя аснована на заключаных намі дагаворах і яна поўнасцю адпавядае інтарэсам Совецкага Саюза. Гэта пазіцыя аказвае, разам з тым, стрымліваючы ўплыў на расшырэнне і распальванне вайны ў Еўропе і таму яна ў інтарэсах усіх народаў, якія імкнуцца да міру і стогнуць ужо ад новых велізарных ліхаў, выкліканых вайной.

Падводзячы вынікі апошняга перыяду, мы бачым, што ў справе забеспячэння безапаснасці нашай краіны мы зрабілі за гэты час нямалыя поспехі. Вось гэта і прыводзіць у шаленства нашых ворагаў. Мы-ж, верачы ў сваю справу і ў свае сілы, з усёй паслядоўнасцю будзем прадаўжаць нашу знешнюю палітыку няўхільна і далей. **(Бурныя, працяглыя апладысменты ўсёй залы. Дэпутаты ўстаюць).**

****

В. МАЯКОЎСКІ

ДОБРА!

Кастрычніцкая паэма

(Урыўкі)*

12.

Ходзяць
спекулянты
вакол Галоўтопа.
Абдымуць,
зацалуюць,
заб'юць за руп.
Сакратарршы
адказныя
валенцамі
шлёпаюць.
Па хлебныя
па карткі
стаяць лесарубы.
З працы
ўпацелі,
мала-ж
гора ім:
Фунт
— цэлы! —
першай катэгорыі.
Рубяць,
ліпавы
чай
выпіўшы,
мы
не Філіпавы,
мы —
прывыкшыя.
Будзе
абед,
вячэра
будзе, —
белых-бы
вунь
адбіць ад варот.
Пояс тужэй,
калі голад
нудзіць.
у рукі вінтоўку
і
на фронт.
А
міма —
незамянімы
ботам
грукочуць, —
па паёк крочыць —
праўленне
выдала
ўрук
і павідла.
Багатыя —
злоўчаны,
на харчы
ў Зундэловіча.
Ні шчоў,
ні каш —
біфштэкс
з бульёнам,
хлеб
ваш,
паўтара мільёна.
Вучоным горш:
к хлебу
фосфар
трэба, —
масліца-б,
вось.
Як
на ліха:
рэвалюцыя ёсць,
масла
ні слыху.
Яны —
навуковыя.
Напішуць,
вылечаць, —
мандат, рукою
Анатоль Васільевіча.
Дзе
хлеб,



* * *

каўбаса,
прыдуць
не ў час к вам.
Чытае
камісар
мандат Луначарскага,
«Так...
цукар...
так...
жырок вам.
Дроў...
бярозавых...
сушэйшых чурбанняў...
І шубу
шырокага
ўжывання.
Я ў вас,
таварыш,
пытаюся ва ўпор:
хочаце —
бярыце
галаўны ўбор.
Пруцца
адусюль
з усякаю ўсячынай.
Бярыце
пакуль-
нагу
канячую!»
Рад —
не рад,
як баба-яга,
ідуць
назад
на трох нагах.

13.

Дванаццаць
квадратных аршынаў жылля.
Чэцвера
ў цесных сценах.
Ліля,
Ося,
я
і сабака
Шчэнік.
Шапчонку
ўзяў
падраную
і вывалак салазкі.
— Куды ты?
— У прыбіральную
іду.
На Яраслаўскі.
Як ветразь,
шуба
на вятру,
і ваніць
казлом яна.
Чурбан
на санчаках туру,
забраў
паркан разломаны.
Чурбан той —
тушаю,
цвярдзей каменя.
Нібы
распушшае
калена
веліканняе.
Прынёс
бярно ў абдымку.
Выпацеў,
вымак.
Важна
і чынна
пічапаю лучыну.
Нож —
іржа.
Рэжу.
Радуюся.
У галаве
жар
падымае градусы.
Расквітнеў нібы сад,
май
пяе
ў вушы, —
гэта
пягнецца чад
з-пад настылых юшак.
Чэцвера сасулек
прыціхлі,
заснулі.
Прыходзяць
людзі,
ходзяць,
будзяць.
Не дадуць рады —
зайшліся
з чаду.
Сувей гарбаты
праз вакно
цікуе:
што там з намі?
Ідуць,
рыпяць
марозы ў ноч
ботамі-снягамі.
Небасхіл,
што навіс
над пакоем маім,
морам
заходу
абліт.
Плывуць,
ружавеюць
на поўдзень
па ім
хмары-караблі.
За далеч,
за марозную,
кідаць якары,
туды,
дзе бярозавая
дрыўня
гарыць.
Я
шмат
па цёплых краінах блукаў.
Ды толькі
ў гэтай зіме
сэнс
і вагу
цеплыні
апшукаў —
каханняў,
дружб
і сямей.
Ты паляжы
ў гэткі сіберны дзень,
зубамі
разам
паляскай —
спяміш
тады:
шкадаваць для людзей
нельга ні коўдры,
ні ласкі.
Зямлю,
дзе паветра —
салодкі морс,
пакінеш,
і не ў галаве, —
зямлю-ж,
з якою ты
разам мёрз,
не разлюбіць
вавек.

Пераклалі
Р. ЛЫНЬКОЎ і Ц. КРЫСЬКО.

*) Палкам паэма друкуецца ў выходзячым днямі ў ДВБ зборніку выбраных твораў В. Маякоўскага.



На будаўніцтве Палаца Советаў у Маскве. У майстэрні манументальнага жывапісу. Мастак **В. Г. Андрэеў** за работай над фрэскай «Лётчык» (побач—эскіз да фрэскі).
Фота-кліша ТАСС.

****

Н. ЛЕВІН

ПОЎВЕКА ТАМУ НАЗАД...

У 1934 годзе З. Бядуля напісаў аўтабіяграфічную аповесць «Набліжэнне». Аповесць павінна была паказаць набліжэнне рэвалюцыйных падзей 1917 года і рост рэвалюцыйнай свядомасці працоўных мас. Аднак З. Бядуля не здолеў правільна ўбачыць і мастацка асэнсаваць складаныя падзеі гэтай велічнай эпохі. Замест таго, каб паставіць сабе галоўнай мэтай правільнае, строга аб'ектыўнае асвятленне жыцця ва ўсёй яго шматграннасці, З. Бядуля ўсяляк падкрэслівае моманты соцыялагічнага характару. Іменна ў сілу гэтага непісьменныя салдаты і сяляне пачынаюць размаўляць складанымі палітычнымі формуламі. Адсюль і кампазіцыйная спрошчанасць аповесці, яе залішняя прасталінейнасць у абрысоўцы характараў.

Лепшымі ў аповесці з'яўляюцца тыя старонкі, у якіх З. Бядуля расказвае аб зверскіх здзеках царскіх казакаў з мірнага беларускага і яўрэйскага насельніцтва, і некаторыя апісальныя эпізоды, рысуючыя быт народа. Гэтыя старонкі парушаюць прасталінейную соцыялагічную схему, выклікаюць у чытача мноства пачуццяў і думак. Гэтыя лепшыя старонкі «Набліжэння» пераклікаюцца з новым творам З. Бядулі «У дрымучых лясах», надрукаваным у восьмай кніжцы журнала «Полымя рэвалюцыі» за мінулы год.

Па кампазіцыйнаму складу твор гэты можна-б было назваць аўтабіяграфічнымі запіскамі. Гэта — прыгожая нізка ўспамінаў пісьменніка аб сваім маленстве і аб першых гадах юнацтва. Асноўным героем запісак з'яўляюцца беларускі і яўрэйскі народы, іхняе жыццё з усімі іх бытавымі акалічнасцямі і соцыяльнымі асаблівасцямі.

Апавядальны стыль твора характарызуецца наступным. Звычайна пісьменнік аглядваючыся па сваё мінулае, асобна вылучае ўспаміны пра самую раннюю, самую першую пару свайго жыцця, уражанні аб якім даходзяць да нас нібы ахутаныя туманам. Вось гэтыя самыя першыя ўражанні і выклікаюць, звычайна, у пісьменніка (ды і ва ўсякага чалавека наогул) асабліва прыўзняты настрой, пяшчотныя і радасныя пачуцці. З. Бядуля пачынае апавяданне з таго моманту свайго жыцця, калі ўспаміны становяцца ўжо яснымі і зусім акрэсленымі. Карціны далёкага мінулага, разгортваючыся перад унутраным зрокам пісьменніка, не выклікаюць у яго, здаецца, асабліва бурных пачуццяў — радасці ці гневу. Аднак, гэты спакой толькі знадворны. Кожны радок, кожная старонка твора насычана глыбокай эмацыянальнасцю, сапраўды паэтычным хваляваннем. У рамках унутранага рытму сваіх запісак З. Бядуля знаходзіць мноства ўнутраных варыяцый і часам яго апавяданне ўзнімаецца да вышынь сапраўднага пафасу, да страснага крыку аб нечалавечых пакутах народа. Такім, напрыклад, з'яўляецца эпізод з бядняччкай Мартай, якая за рубель згаджаецца прайсці босымі нагамі па распаленых цэглах. Эпізод пачынаецца з таго, што мястэчковы ўраднік «...весела абвясціў— хто пройдзе босы па цэглах, таму дам рубля.

Пачуліся галасы:

— Мы не прывыклі да лёгкага хлеба.
— Мне яшчэ рана ў пекла.
— Твая цэгла, сам пяткі грэй.
— Такіх аматараў у нас няма.
— І за дзесяць рублёў не хачу...»

Некалькі вельмі выразных рэплік ствараюць уражанне як-бы дыхання цэлага натоўпу. У гэтым — майстэрства пісьменніка, які добра ведае разгаворную народную мову і выдатна валодае майстэрствам дыялагу.

Далейшая дзея ў спамянёным урыўку разгортваецца наступным чынам: на абяцаны ўраднікам рубель пакваліліся Марта, самая бедная жанчына ў мястэчку, — яна меркавала купіць на гэтыя грошы сала і мукі для дзяцей.

«Удава перахрысцілася кастлявай рукой і ўскочыла на гарачыя цэглы. Адлегласць у дзесяць пякельных крокаў была перад ёю. У яе вачах мільгнуў спалох. Яна сціснула губы, пабляднела і пайшла на пятках. Пад нагамі ледзь дымілася... Людзі прыталілі дыханне. Кожная секунда здавалася гадзінаю. Марта закусіла губы войстрымі белымі зубамі. Яе вочы расшырыліся, з іх цяклі слёзы.

Ураднік сказаў паважна:
— Мерным крокам!..»

Гэта адзін з лепшых раздзелаў у творы. Майстэрства З. Бядулі праявілася тут са значнай сілай. Кароткія абрывістыя фразы ствараюць неабходную тут унутраную дынаміку, напружанасць. Функцыя драбнюткіх дэталей не толькі ў тым, каб удакладніць малюнак, — праз іх праходзіць лінія драматычнага нарастання. Калі ў пачатку эпізода Марта толькі «сціснула зубы, пабляднела», дык у канцы яна ўжо «да крыві пракусіла ніжнюю губу, каб не крычаць».

Глыбокім спакоем, сілай і хараством вее ад тых старонак, якія рысуюць жыццё і быт народа. Надзвычай моцна зроблены зарысоўкі прадстаўнікоў народа, як каваль Гірш Меер, якога ні адзін чалавек у ваколіцы не можа здужаць, як дзед пісьменніка, які калом, падсунутым пад вугал хаты, прыўзнімае ўсю будову... А вось і бацька пісьменніка — мастак-музыкант. Вялікія майстры сваёй справы, сапраўдныя таленты, яны марна гінулі, не маючы магчымасці прабіцца да тых жыццёвых прастораў, якія ім па праву належалі і якія іх чакалі.

З. Бядуля часта ўводзіць у свае запіскі элементы казачнасці, фантастыкі, старадаўнія мудрыя легенды.

Радзей сустракаюцца ў творы пейзажныя зарысоўкі. Іх мала, але-ж яны зроблены па-майстэрску і нямала дапамагаюць пісьменніку ў стварэнні каларыту, асноўнага настрою запісак. Яны асветлены як-бы знутры чыстатой і непасрэднасцю дзіцячага ўсведамлення жыцця.

Вельмі паэтычнымі з'яўляюцца тыя старонкі аповесці «У дрымучых лясах», у якіх З. Бядуля малюе інтэрнацыяналізм народа. З гэтага пункту гледжання трэба вылучыць раздзел «Майстры».

Як многа бескарыслівасці, узаемнага паважання ва ўзаемаадносінах паміж бондарам Данілам і старым кавалём-яўрэем!

У новай аповесці З. Бядулі ёсць і некаторыя слабыя мясціны. Гэта адносіцца, у прыватнасці, да раздзелу «Разбойнік Ціхан». У З. Бядулі разбойнікі выглядаюць ледзь не ангеламі, — такія яны чысценькія, чэсныя, справядлівыя. Між тым вядома, што ў памяці народа разбойнікі не заўсёды рысуюцца такімі. Разбойнікі далёка не ва ўсіх выпадках браліся за нажы і кісцяні для таго, каб выправіць існуючыя соцыяльныя несправядлівасці.

Сцэна сустрэчы бабулькі пісьменніка з Ціханам занадта саладжавая, — у хату-ж прышоў як-ні-як разбойнік, а яму наладжваюць сапраўдны кірмаш, нават цалуюцца з ім.

З. Бядуля разгарнуў перад намі цікавыя і прыгожыя малюнкі з жыцця народа поўвека таму назад. Пісьменніку ўдалося пазбегнуць «эксперыментаў» соцыялагічнага характару. Яму ўдалося па-новаму разглядзець жыццё, мастацка асэнсаваць яго падзеі і факты.

Гэта прынесла яму ўдачу.

«У дрымучых лясах» з'яўляецца творам, які ўзбагачае беларускую літаратуру, уносіць у яе многа цікавага і безумоўна акажа вялікі ўплыў на яе далейшае развіццё.

З. Бядуля. «У дрымучых лясах». Журнал «Полымя рэвалюцыі», № 8, 1939 г.

Старэйшы актор беларускага тэатра

«...З глыбіні паказваецца Нешчасліўцаў... Ён, відаць, стомлен, часта спыняецца, уздыхае і кідае хмурныя погляды з-пад ілба. У той-жа час з другога боку паказваецца Шчасліўцаў.

НЕШЧАСЛІЎЦАЎ (хмурна). Аркашка!

ШЧАСЛІЎЦАЎ. Я, Геннадзій Дзем'яныч! Як ёсць увесь тут.

НЕШЧАСЛІЎЦАЎ. Куды і адкуль?

ШЧАСЛІЎЦАЎ. З Волагды ў Керч-с, Геннадзій Дзем'яныч. А вы-с?

НЕШЧАСЛІЎЦАЎ. З Керчы ў Волагду. Ты пеша?

ШЧАСЛІЎЦАЎ. На сваіх-с, Геннадзій Дзем'яныч...»

Так, у некалькіх рэпліках, паказаў вялікі рускі драматург А. Н. Астроўскі становішча актораў у царскай Расіі. Яны ўсё сваё жыццё ездзілі, а часам і хадзілі з горада ў горад у пошуках хлеба і славы. Адным з такіх актораў быў калісьці і Генрых Юр'евіч Грыгоніс, цяпер заслужаны артыст БССР.

Цяжкія былі яго юнацкія годы. Бацька—дробны чыноўнік мяшчанскай управы ў Вільні застаўся без работы. Каб не быць цяжарам для сям'і, Генрых едзе ў Одэсу, дзе паступае юнгой на карабль і пачынае вандроўку па свету. Рэйсы Одэса—Владзівасток і назад. Летам ён матрос, зімой—статыст у тэатры. Паміж гэтымі двума прафесіямі кідаецца малады хлапец. Паступіць на мараходныя класы ці ў тэатр?

Нарэшце, перамог тэатр. З 1907 года Генрых Юр'евіч—артыст трупы Арнольдава ў Владзівастоку. Ён спыняецца ля кожнага вугла, каб прачытаць яшчэ і яшчэ раз сваё прозвішча на тэатральнай афішы. Одэса, Владзівасток, Хабараўск, Харбін, Благавешчанск, Сахалін, Нікалаеўск-на-Амуры, Ленінград, Вільня і г. д. і г. д., пакуль у пачатку 1921 года не пераязджае ў Мінск і не ўступае ў трупу Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра. Маючы ўжо значны акторскі вопыт, Генрых Юр'евіч займае вядучае становішча сярод актораў тэатра.

Адной з першых ролей, сыграных Г. Ю. Грыгонісам у Беларускім драмтэатры ў 1921 годзе, была роля Лукі ў п'есе М. Горкага «На дне» (пастаноўка нар. арт. БССР Е. А. Міровіча). Ён правільна зразумеў гэты вобраз і яго Лука быў «лукавым» старым, які сам не верыў, што ёсць праведная зямля, але рабіў выгляд, што верыць, суцяшаючы абяздоленых людзей. Праўда, актора можна было-б папракнуць у тым, што яго Лука быў занадта «елейны», нехапала некаторага сарказму, напрыклад, у сцэне з Мядзведзевым, але ў аснове сваёй правільна, з майстэрствам раскрыты вобраз прынёс Генрыху Юр'евічу заслужаную ўхвалу гледача.

Надзвычай добра і правільна, па заяве самога аўтара п'есы, быў зроблен Грыгонісам вобраз Дораша («Машэка» Е. Міровіча), угодлівага пад'ячага, баязліўца, паклёпніка і здрадніка, які дзеля сваёй асабістай карысці здраджвае, нарэшце, і князю, свайму гаспадару.

Побач з такімі фарбамі на акторскай палітры, як мяккасць, задушэўнасць, прыродны гумар, Генрых Юр'евіч знаходзіць для стварэння вобраза генерал-губернатара Мураўёва жорсткасць сатрапа, вешацеля паўстанцаў, які ненавідзіць нават слова «свабода», а таму лічыць «пяньковы гальштук» самым надзейным сродкам для ўціхамірання нездаволеных мас.

Без націску, мякка, хоць у актора была спакуса ўпасці ў шарж, іграў Генрых Юр'евіч ролю Журдэна ў п'есе «Мешчанін у шляхецтве» Мальера. Чотка і правільна данесенае акторам да гледача асноўнае жаданне Журдэна пралезці ў дваране, стаць вядомым—рабіла яго дурным і смешным.



Г. Ю. Грыгоніс.

Актор сугуба рэалістычнага напрамку, Г. Ю. Грыгоніс не мог не пратэставаць супроць засілля рэжысёраў-фармалістаў, якія прышлі ў тэатр, а таму прышоўся «не да двара», быў залічан у разрад «устарэлых» актораў.

Калі-ж калектыў тэатра ў барацьбе за соцыялістычнае мастацтва вызваліўся ад шкоднага ўплыву, на сцэне зноў паявіліся поўнакроўныя вобразы, створаныя Генрыхам Юр'евічам.

Адным з яскравых вобразаў гэтага часу трэба прызнаць Бубліка ў «Платоне Крэчаце» Карнейчука. Стары земскі ўрач, які выслухаў на працягу свайго жыцця 90.000 пульсаў, і адданы сваёй рабоце дзівак са старамоднымі манерамі і вопраткай, ён цалкам адданы нашаму часу совецкі чалавек. З вялікай сімпатыяй прымаў глядач Бубліка ў выкананні Г. Ю. Грыгоніса.

Вялікай любоўю, адданасцю да свайго выхаванца насычан вобраз дзядзькі Савельіча ў «Капітанскай дачцы» па Пушкіну. Ён руплівы, гаспадарны слуга, які перанёс на свайго выхаванца вялікую любоў да людзей. Гэты абаяльны і чуллівы вобраз, створаны Г. Ю. Грыгонісам, надоўга застаўся ў памяці гледача.

Яскравы, запамінаючыйся вобраз стварыў актор у невялікай ролі шляхціч[illegible] Мазавецкага ў «Бацькаўшчыне» К. Ч[illegible]нага. Грыгоніс дасканала паказаў г[illegible]дачу дробнага крывасмока, які імкне[illegible] ўвайсці ў хаўрус з больш буйным к[illegible]васмокам кулаком Сурвілам, каб, рас[illegible]даўшы сялянам дробнымі ўчасткамі [illegible]млю, закабаліць іх, высмоктваючы а[illegible]нія сілы.

Сапраўднай народнасцю насычан [illegible]браз дзеда Міколы з «Салаўя» З. Б[illegible] Гэты вобраз характарызуе рост [illegible]масці беларускага селяніна, які пад[illegible]най маскай прыдуркаватасці хавае [illegible] прыродны розум і жыццёвы во[illegible] яго заўсёды знойдзецца прымаўк[illegible] заная заўсёды дарэчы і заўсёды [illegible]ваная супроць свайго адвечнага [illegible]тальніка — польскага пана, як [illegible] супроць прыгнечання.

У «Кацярыне Жарнасек» К[illegible] актор намаляваў каларытную і [illegible] навучую фігуру старога бандуры[illegible] гаварыць людзям словы праўды, [illegible] на барацьбу супроць прыгнятальн[illegible]

Апошнія работы Грыгоніса — [illegible]ленагіта зробленыя ролі: ры[illegible] з «Пагібелі воўка» Эд. Сам[illegible] Нічыпар з камедыі «Хто с[illegible]ен нім» К. Крапівы. Гэтыя аба[illegible]разы простых совецкіх людз[illegible]юцца надзвычай цёплым прыём[illegible]дача, які гарачымі воплескамі [illegible] сваю ўдзячнасць і любоў да зас[illegible] артыста БССР Г.Ю. Грыгоніса.

К. Н. САНН[illegible]

МАЯ РАБОТА НАД

Адразу-ж пасля сканчэння Дзяржаўнай кансерваторыі БССР па класу кампазіцыі прафесара В. А. Залатарова ў 1937 годзе я прыступіў да напісання музыкі балета «Салавей».

Аповесць Змітрака Бядулі «Салавей», тэма якой скарыстана намі ў балеце, хвалявала мяне сваёй глыбокай шчырасцю. Герой гэтай аповесці Сымон стаў мне вельмі блізкім. Вобраз Сымона, разумнага і моцнага, горача любячага Зоську і ненавідзячага ад усёй душы паноў, гайдукоў і войтаў, натхніў мяне на работу над балетам.

Усе мы, аўтары спектакля, доўга шукалі прынцып, на якім павінен будавацца балет — беларускі па сваіх вобразах, танцавальны ў балетным, а не ў этнаграфічным сэнсе. Канчатковая рэдакцыя клавіра і партытуры склалася ў выніку доўгіх пошукаў адзінага музыкальнага і сцэнічнага стылю першага беларускага балета. Не ўтаю, што на гэтым шляху было нямала памылак і істотных змен, якія зрабілі музыку непазнавальнай у параўнанні з пачатковым замыслам.

Цяжкасці работы заключаліся ў тым, каб забяспечыць разгортванне спектакля, які не абмяжоўваецца дэманстрацыяй народных танцаў. Бадай, самае лёгкае было стварыць ці, правільней кажучы, апрацаваць сюіту агульнавядомых фальклорных плясак — «Лявоніху», «Крыжачок», «Бульбу», «Юрачку» і г. д. Аднак, гэтыя танцы ўваходзілі ў спектакль не столькі як дывертысмент, колькі як элемент музычнай і сцэнічнай драматургіі. Вось гэта было цяжка: раскрыць у агульнавядомай плясавай музыцы вобразы герояў, не губляючы [illegible] характэрных нацыянальных р[illegible]

Так, напрыклад, я вы[illegible] І-га акта, калі з народнага т[illegible]ка» вырастае першы канфлі[illegible] гайдукамі дзяўчат, агляд і в[illegible] іх забранне, драма Сымона. [illegible]юцца дзейсныя танцы Зоські [illegible] якія абапіраюцца на знаёмь[illegible]ныя пляскі, але адначасова [illegible]юць герояў, іх душэўнае с[illegible] асабістыя рысы.

Але і гэтага было мала [illegible] клавіра. Лік агульнавядомы[illegible] танцаў невялікі. Мы выра[illegible]сіць даўно забытыя танцы, [illegible] на іх апісанне, тэксты пе[illegible]рытмаў і г. д.

Народная песня падказа[illegible] сцэн балета. Так, у харав[illegible] дзяўчат скарыстаны добры[illegible] чырвоная каліна» і «Пера[illegible] песні па-сапраўднаму хвал[illegible] шмат гуллівасці, цеплыні, [illegible]рыкі. Танец роспачы Зо[illegible] акце будуецца на матэры[illegible] народнай песні. У сцэна[illegible] адпраўным пунктам для [illegible]най драматургіі, асноўна[illegible] стання народнай песні [illegible]цыйная.

Але займаць ці пера[illegible]лорныя песні не азнача[illegible]вір. Большасць дзейсны[illegible] мною і не маюць ніякі[illegible] музыкальным фальклор[illegible] існавання побач з імі [illegible]

Б. СМОЛЬСКІ

ОПЕРА „МІХАСЬ ПАДГОРНЫ" І ЯЕ АЎ...

Першая беларуская нацыянальная опера «Міхась Падгорны» Е. К. Цікоцкага належыць да ліку выдатных твораў совецкай музычнай культуры.

Опера пра гераічную барацьбу беларускага народа за сваё нацыянальнае і соцыяльнае вызваленне захапляе сваёй глыбокай эмацыянальнасцю, цеплынёй і непасрэднасцю.

Аўтар оперы «Міхась Падгорны» Е. К. Цікоцкі — адзін з вядучых кампазітараў старэйшага пакалення Беларускай рэспублікі. Ён належыць да той групы кампазітараў, якія сфарміраваліся і творча выраслі пасля Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. Сваёй рознастайнай творчай дзейнасцю кампазітар заваяваў вялікую любоў і папулярнасць працоўных ордэнаноснай рэспублікі.

Нарадзіўся Еўгеній Карлавіч у 1893 годзе ў Ленінградзе, у скромнай сям'і дробнага чыноўніка. Цяга да музыкі праявілася вельмі рана. З шасці год ён па слуху іграў на фортэп'яна, а ў гімназічныя годы складаў маленькія танцы, песні, не маючы ўяўлення аб тэорыі. З 1911 года пачаў займацца ў музычным вучылішчы. Заняткі перарвала мабілізацыя ў армію ў 1914 годзе.

Новы творчы этап у жыцці Цікоцкага наступае пасля Кастрычніцкай рэволюцыі. Прызваны ў рады Чырвонай Арміі кампазітар разгортвае велізарную грамадскую і музычную работу па кіраўніцтву і дапамозе гурткам мастацкай самадзейнасці. У Чырвонай Арміі ён знаходзіць актыўную і ўважлівую аудыторыю для сваіх першых твораў на новую, совецкую тэматыку.

Чырвоная Армія адыграла вялікую ролю ў жыцці кампазітара. Яна выхавала яго ў духу беззаветнай адданасці радзіме, свайму народу і яго гераічнай барацьбе за лепшае жыццё. Вось чаму ўжо ў першых творах, як «Буравеснік» на словы М. Горкага, песня Н-скай дывізіі, эскізы 1-й сімфоніі, гучыць гераічная тэма, дадзены вобразы народных герояў.

Значным творам кампазітара трэба лічыць яго 1-ю сімфонію «Вызваленне Беларусі ад белапалякаў» (скончана ў 1929 годзе). У ёй кампазітар рысуе карціну цяжкога мінулага, баявыя эпізоды грамадзянскай вайны і трыумф — перамогу беларускага народа над белапалякамі. Сімфонія характэрна сваёй шырокай меладычнай лініяй, драматызмам і ярка



Е. К. Цікоцкі.

выражанай героікай у апошняй частцы. Пры ўсіх сваіх недахопах (рыхласць формы, расцягнутасць, слабасць аркестроўкі і г. д.) яна адыграла вялікую ролю ў справе стварэння беларускай сімфанічнай музыкі.

Наступнымі буйнымі творамі кампазітара з'явіліся: музычная камедыя «Кухня святасці», вакальна-сімфанічная паэма «Буравеснік» (новая рэдакцыя) і надзвычай цікавы твор «Скупы рыцар» на словы Пушкіна для голаса (бас) з аркестрам. Аўтар у двух апошніх творах звяртаецца да класічнай рускай літаратуры, да яе паэтычных вобразаў, знаходзячы ў іх невычарпальную крыніцу творчага натхнення. Ужо тут кампазітар паказаў свае вялікія дараванні, творчую спеласць і майстэрства.

Адначасова з работай над буйнымі творамі кампазітар аддае вялікую ўвагу музычнаму афармленню спектакляў беларускіх драматычных тэатраў, дзе ён праяўляе шмат творчай арыгінальнасці і вынаходлівасці. Кампазітарам напісана музыка да 22 спектакляў драматычных тэатраў БССР. Акрамя таго, за час з 1931 па 1939 год кампазітарам напісан рад хораў, масавых песень, маршаў, уверцюра для духавога аркестра, 15 танцаў для цымбальнага ансамбля, канцэрт для трамбона і г. д.

Адначасовая работа ў розных напрамках і розных жанрах гаворыць аб шырыні мастацкага дыяпазону кампазітара і аб жаданні найбольш шматвобразна праявіць свае творчыя магчымасці і авалодаць тэхнікай рознастайных форм.

У 1937 годзе пачалася вялікая творчая работа над стварэннем оперы «Міхась Падгорны» па лібрэта паэта-ордэнаносца П. Броўкі. Праз два годы, у гонар адкрыцця XVIII партз'езда, опера была пастаўлена ў Тэатры оперы і балета БССР і выклікала жывейшую цікавасць у працоўных беларускай сталіцы, як першы музыкальна-драматычны твор на беларускую нацыянальную тэматыку.

Пастаноўка оперы ўскрыла рад істотных недахопаў: слабасць драматургічнага развіцця, раздробленасць дзеяння, мноства рэчытатываў, расцягнутасць асобных актаў і ўсёй оперы ў цэлым, непаўната ў абрысоўцы асноўных вобразаў і перш за ўсё галоўных герояў оперы — Міхася і Марысі. У сувязі з гэтым было вырашана оперу дапрацаваць, зменшыць асобныя сцэны, ярчэй паказаць асноўныя вобразы і г. д. Другая рэдакцыя оперы, якую кампазітар стварыў у творчым супрацоўніцтве з лібрэтыстам П. Броўкам і ўсім калектывам тэатра, кардынальна адрозніваецца ад першай.

Сюжэт оперы пераносіць нас у недалёкае мінулае беларускага народа.

Батрак Міхась Падгорны любіць маладую сялянскую дзяўчыну Марысю, але кулак Закрэўскі, выкарыстаўшы яго адыход у армію, распаўсюджвае чуткі аб яго смерці і з дапамогай бацькоў Марысі дабіваецца згоды на шлюб з ёй. На просьбы вярнуўшагася з фронта Міхася пакінуць ненавіснага мужа, Марыся адказвае маўчаннем... Яна баіцца рэлігійных законаў і людскіх плётак. Міхась поўны трывожных перажыванняў, ён ненавідзіць багатых, праклінае вайну, але не разумее, хто вінаваты ў тым, што ракою льецца народная кроў. Яму на дапамогу прыходзіць стары большэвік Анішчук, які растлумачвае значэнне адбываючыхся падзей і ўцягвае яго ў рэволюцыйную ба[illegible]

[illegible] велізарнай вартасцю лібрэта, якое напісана сакавітай і маляўнічай мовай, з'яўляецца тое, што яно дало магчымасць кампазітару праўдзіва і глыбока паказаць простых людзей, — людзей, якія былі прыгнечанымі здавеку, паказаць асноўнага героя — народную масу пры захаванні яркай індывідуальнасці асноўных вобразаў.

Надоўга запамінаецца свабодалюбівы беларускі батрак Міхась, які праз рад вострых канфліктаў асабістага жыцця далучаецца да ўдзелу ў соцыяльнай барацьбе. Яго моцная любоў да Марысі не засланяе, а дапамагае яму знайсці сваё месца ў барацьбе за новае жыццё.

Вельмі эмацыянальна нарысаван вобраз простай і шчырай сялянскай дзяўчыны Марысі, якая поўна мыслямі аб будучым шчаслівым жыцці з Міхасём, але якой цяжкая беспрасветная сапраўднасць дарэволюцыйнай беларускай вёскі рыхтавала іншую долю. Гвалтоўна выдадзеная замуж за нялюбага, яна горка аплаквае свой лёс, свае дзявочыя мары.

Шчыра і проста паказана Ганка — сяброўка Марысі, якая страціла на вайне мужа і скардзіцца на сваё адзінокае жыццё.

Анішчук — усеагульны любімец, які заваяваў вялікую сімпатыю і павагу ў сялян. У оперы паказаны і ворагі народа — сям'я азвярэлага кулака Закрэўскага.

«Міхась Падгорны» — твор ярка выражанага нацыянальнага стылю. Нават лепшыя традыцыі класічнай оперы, якія ёсць у гэтай оперы, падпарадкаваны стылю беларускага нацыянальнага мастацтва. Нацыянальнасць оперы раскрываецца ў сутнасці тэматыкі, у паэтычных вобразах лібрэта і ў выдатным музычным матэрыяле. Меладычнае багацце оперы шчыльнейшым чынам звязана з беларускай народнай песняй, якая абумовіла стылевую цэльнасць, стройнасць вакальна-музыкальнай лініі, даступнасць і папулярнасць оперы. Глыбокае засваенне беларускай народнай песні, якая адрозніваецца цеплынёй пачуцця і меладычнасцю, дало магчымасць кампазітару даць трапную і выразную характарыстыку сваім персанажам.

Цэнтральны вобраз оперы — Міхась — ужо з першага акта атрымлівае яркую і рэльефную музыкальную характарыстыку ў лірычным дуэце з Марысяй, які па глыбіні зместу, выразнасці і гукавай прыгажосці з'яўляецца лепшым вакальным нумарам оперы. Пасля дуэта ідзе невялікі [illegible]

Лейтматывы, атрымліваючы лірычны альбо гераічны характар, сродкамі сімфанічнага развіцця ўносяць вялікую рознастайнасць і свежасць у музычную тканіну оперы. Цікава ў гэтым выпадку прывесці прыклад з лейтматывам з песні «Я табун сцерагу». Тэма ў пачатку І-га акта паяўляецца ў выглядзе пастушай песні — лірычнай, сумнай, якая рысуе вечар беларускай вёскі. У канцы акта, у сцэне прызыву Міхася ў армію — яна пакутліва надламана. Такой-жа драматычна напружанай застаецца тэма ва ўступе да IV-га акта, набываючы нават грозную сілу, але перад гэтым у сумнай арыі Міхася, пасля адыходу Марысі ў III-м акце, гучыць ціха і сумна.

Асаблівую ўвагу кампазітар аддае характарыстыцы Марысі. Яе вакальная партыя, пазбаўленая вонкавых эфектных прыёмаў, незвычайна натуральна апраўдана псіхалагічна. Глыбокае ўражанне пакідае яе арыя з II-га акта, дзе яна спявае аб сваім безуцешным горы, аб той цяжкай долі, якая была абыдзённай з'явай у беларускай вёсцы. Тым радасней становіцца, калі яна вырастае да ўсвядамлення патрэбы назаўсёды парваць са сваім мінулым.

Вобразы Анішчука і Ганкі паказаны менш выпукла. Музыкальная характарыстыка Анішчука не зусім самастойная. У Ганкі месцамі высокая тэсітура не дазваляе ёй поўнасцю паказаць багатую драматычную партыю. Характарыстыка кулака Закрэўскага вырашана кампазітарам у плане паказу яго двухсэнсоўных якасцей. Лірыка яго — няшчырая, фальшывая. Лейтматыў, які характарызуе Закрэўскага, не звязан з народнай песняй.

Адначасова з дэтальнай распрацоўкай і характарыстыкай галоўных дзеючых асоб, якія ў асноўным вызначаюць лінію развіцця дзеі, кампазітар разгортвае ў шырокім плане масавыя харавыя сцэны. Масавыя харавыя сцэны, пераканальныя ў сваёй прастаце, носяць глыбока народны характар. Як і сольныя нумары, яны поўны жвавасці і шчырасці. У іх няма надуманасці і няяснасці, бо ў аснове іх ляжыць простая народная песня. Мы ведаем, што народная песня неаддзяліма ад народа. Песня заўсёды была з народам. Яна заўсёды спадарожнічала яму ў горы, радасці і барацьбе. Адсюль і глыбіня і праўдзівасць оперы Цікоцкага.

[illegible] Ганкі «Гэй, узніміцеся, буйныя ветры», песня бабы-лапатухі з хорам «Прышоў на вяселле наш сваток» і іншыя. Побач з гэтым у оперы ёсць рад арыгінальных хораў у народным стылі: «Не лажыце мяне, братцы, на траўцы-мураўцы», «Не плач, матуля» і іншыя.

Велізарнае ўражанне робяць масавыя сцэны І-га акта. Калі сабраўшыяся дзяўчаты і хлопцы пачынаюць выяўляць свой настрой і радасць у народных танцах, дык перад гледачом сапраўды ва ўсёй сваёй непасрэднасці ўстае шматфарбная карціна масавай народнай весялосці. Беларускія танцы, выконваемыя ў І-м акце, характэрны сваім меладычным багаццем, рознастайнасцю і масавасцю на адкрытым месцы, на вуліцы, поплаве і г. д. Гэта нацыянальная асаблівасць беларускага танца поўнасцю захавана ў оперы.

Развіццё оперы ідзе ўвесь час у сімфанічным плане, бо не гледзячы на ўсю песеннасць оперы, яна глыбока сімфанічная ад уверцюры да заключнай сцэны. У сувязі з гэтым узрастае значэнне аркестра, які іграе не меншую ролю, чым салісты і хор. Нярэдка ў аркестравай тканіне паяўляюцца самастойныя эпізоды, якія, развіваючыся паралельна з вакальнай лініяй, падкрэсліваюць асноўны настрой і сцэнічнае палажэнне. Такім чынам, аркестр ператвараецца часам у тлумача драматычнага развіцця. Гэта адносіцца не толькі да такіх самастойных аркестровых нумароў, як надзвычай яркая ўверцюра, у якой раскрываецца асноўная ідэя оперы, ці ўступ да IV акта, дзе кампазітар імкнуўся сімфанічнымі сродкамі адлюстраваць кастрычніцкія падзеі. Гэта адносіцца да аркестровага эпізода пасля лірычнага дуэта Міхася і Марысі ў І-м акце, да бліскучага аркестровага выбуху—лікаванне ў момант прыходу свабоднага Міхася ў вёску ў IV акце і г. д.

Опера «Міхась Падгорны» Еўгенія Карлавіча Цікоцкага з'яўляецца выдатным творам беларускай культуры. Гістарычнае значэнне яе вялікае, бо яна з'яўляецца першай беларускай нацыянальнай операй, у якой упершыню дадзены вобразы простых, але надзеленых глыбокімі пачуццямі, благародствам і прыгожасцю беларускіх сялян.



...ынер гуказапісу Ленінградскага радыёкамітэта, комсамолец **А. І. Сафронаў** ...ю ў СССР распрацаваў новы метад трывалага запісу гука на воск. Новы ...е магчымасць рабіць высокаякасныя радыёперадачы музыкальных твораў.

...ЗДЫМКУ: А. І. Сафронаў ля запісваючай устаноўкі ў студыі Ленінград...ыёкамітэта.

Фота-кліша ТАСС.

ШАРЫФ КАМАЛ

...авіка 1940 года пісьменніцкая ...ць і ўсе працоўныя Савецкай ...вяткавалі 30-годдзе грамадска...й дзейнасці буйнейшага та...савецкага пісьменніка, класіка ...літаратуры Шарыфа Камала.

...л нарадзіўся ў 1884 годзе. ... вершы і навелы адносяцца ...910 год.

...майстэрскіх навел, як «Дэ...лісаваны званок», «Двухга...» і інш., Ш. Камал едка вы...вышэйшае» грамадства, бур...цыяналістаў, філісцёраў. У ... пісьменнік напісаў твор ...аповесць з жыцця сезонні... У 1915 годзе паяўляецца ...Камала «Хаджы Эфендзі жа...ожа» сустрэтая буржуазіяй, ...а ў п'есе востраю сатыру ...сваю мараль і быт.

...ыялістычная рэвалюцыя да...ь Ш. Камалу шырока раз... талент, ён выступае ў ...ніка-празаіка, драматурга, ...етку 1918 года, калі бан...ла Орэнбург, Ш. Камал ...амі ў падполле. Пазней ...зеце Палітаддзела 1-й Ар... «Кзыл Юлдуз» («Чырво...м у 1919 годзе Ш. Ка...камуністычную партыю

Ш. Камал выпусціў ра...які рысуе дарэвалюцый...авінцыі Расіі, у цэнтры ...зіі — Орэнбургу, паміж ...нікам 1917 года. У су...тар працуе над пра...

...1929 года, выходзіць рад буйных драматычных твораў Ш. Камала: «Агонь» — п'еса аб гаспадарчым будаўніцтве Савецкага Саюза; «Варонне гняздо»—аб жыцці шахцёраў у 1904—1905 гг.; «За туманам» — аб росле савецкай інтэлігенцыі. З 1935 года пісьменнік працуе над эпапеяй «Калі нараджаецца прыгожае». У ёй Ш. Камал ставіць сабе мэтай паказаць працэс росту новага чалавека. Першая частка эпапеі надрукавана ў 1937 годзе, другая частка падрыхтоўваецца да друку.

За трыццаць год літаратурнай дзейнасці Ш. Камал даў шмат каштоўных мастацкіх твораў, якія з'яўляюцца залатым фондам татарскай літаратуры.

Ш. Камал — творац рэалістычнай школы ў татарскай літаратуры, яго творы з'яўляюцца ўзорам рэалістычнага паказу рэчаіснасці.

Ш. Камал пісьменнік — грамадскі дзеяч. Ён працуе ў літаратурных арганізацыях, з'яўляецца членам рэдкалегіі літаратурна-мастацкага журнала «Совет Эдэбіяты». Партыя вырасціла з яго непрымірымага змагара за шчасце працоўных, за перамогу соцыялістычнай культуры. Творы Ш. Камала шырока вядомы за межамі Татарскай рэспублікі. Яго кнігі распаўсюджваюцца не толькі сярод татар, але і сярод братніх народаў усяго Савецкага Саюза.

Працоўныя высока цэняць творчасць Шарыфа Камала. У канцы 1934 года яны адсвяткавалі 25-гадовы юбілей яго літаратурнай дзейнасці. У сувязі з гэтым пісьменнік атрымаў шмат прывітанняў і падарункаў ад рабочых, сялян і інтэлігенцыі з усіх канцоў нашай вялікай радзімы.

Л. САМСОНАЎ.

...эатр у Баранавічах

...чак з'ехаліся на нара... свой акруговы цэнтр, ...ыя парабкі... Увечары ... ў гарадскі тэатр на ...бласнога драматычнага

Аўгіння палошча ў ...лалку ўскочыла яе ...учы вянок, яна па...о аб цяжкім, горкім, Уваходзяць Мартын, ...зей Талаш. Рухавы, ...дважны арганізатар ...га атрада адразу-ж ...едача. І калі пар... белапольскіх паноў ...ледачы стоячы па...ь і ў адзін голас ...ь «ура»!

Так прымалі гледачы першы паказ спектакля «У пушчах Палесся».

Глядач азнаёміўся з тэатрам, прагледзеўшы п'есы: «У пушчах Палесся» Якуба Коласа, «Мой сын» Гергеля і Літоўската, «Пагібель воўка» Эд. Самуйлёнка. На чарзе — «Егор Булычоў» М. Горкага, «Дура для іншых, разумная для сябе» Лопе дэ Вега. Паралельна ідзе работа над новым спектаклем «Сады квітнеюць» Масс і Куліченка. Ставіць гэту п'есу рэжысёр А. І. Лізункоў. У плане тэатра п'есы Гальдоні, Мальера.

Творчы склад тэатра — 35 чалавек. Амаль палова іх — акторы былой Заходняй Беларусі. Цяпер яны атрымалі вялікае і пачэснае права — працаваць для народа, развіваць свае творчыя здольнасці.

Барыс САВІЧ.

ГРАМЗАПІС ТВОРАЎ БЕЛАРУСКІХ КАМПАЗІТАРАЎ

Брыгада Ленінградскай студыі мастацкага гуказапісу закончыла запіс на грампласцінкі раду музычных твораў беларускіх кампазітараў у выкананні салістаў Тэатра оперы і балета, Філармоніі, Кансерваторыі, Радыёкамітэта і асобай групы дзіцячай музычнай школы. Усяго запісана каля 250 твораў (звыш 280 пласцінак), у тым ліку рад арый з опер «Кветка шчасця», «У пушчах Палесся», «Міхась Падгорны», «Кацярына» — у выкананні заслужаных артыстаў рэспублікі Мурамцава, Балоціна, Млодэк, Друкер, Дзянісава, Аляксеевай і інш. Запісаны ўрыўкі з п'ес «Партызаны» і «Хто смяецца апошнім»—у выкананні народнага артыста Глебава, заслужанага артыста Бірыла, артыстаў Шапіла, Полла, Шынко.

Запісаны выступленні хора і аркестра народных інструментаў Белдзяржфілармоніі, квартэта Белрадыёкамітэта і інш.

—⊙—

Творчасць кампазітара Фрэйдзона

У Мінск для азнаямлення кампазітараў са сваёй творчасцю прыехаў з мястэчка Дзятлава Баранавіцкай вобласці кампазітар Фрэйдзон. На першай сустрэчы тав. Фрэйдзон азнаёміў кампазітараў са сваёй операй «Мартын Ідэн» па Джэку Лондану (паводле ўласнага лібрэта), з сімфоніяй і радам аркестровых і камерных твораў.

У сучасны момант тав. Фрэйдзон мяркуе працаваць над сімфанічнай паэмай «Вызваленне Заходняй Беларусі».

—⊙—

Нарада аб рабоце эстрады

Сёння, 3 красавіка, ва Упраўленні па справах мастацтваў пры СНК БССР адбудзецца творчая нарада работнікаў Белдзяржэстрады з пісьменнікамі, кампазітарамі і артыстамі тэатраў. Будзе абмеркавана пытанне стварэння савецкага беларускага рэпертуару, а таксама дзейнасці эстрады ў сувязі з пастановай Камітэта па справах мастацтваў пры СНК СССР аб рэжыме эканоміі ў тэатральных калектывах.

—⊙—

Рускі тэатр у Брэсце

Рускі дзяржаўны тэатр у Брэсце рыхтуе спектаклі «Любоў Яравая», «Васса Жалезнова» і «Слуга двух паноў». Адкрыццё тэатра намечана на 1 мая. Зараз праводзіцца капітальнае перааб'сталяванне сцэнічнай пляцоўкі, засцэннай часткі і глядзельнай залы.



У Брэсцкай абласной музычнай школе. Выкладчык В. І. Пажыцкі дае ўрок сыну чыгуначніка Тарасу Шыйко.

Фотахроніка БЕЛТА.

...прадгісторыя беларускага тэатра

Да Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі беларускага прафесіянальнага тэатральнага мастацтва не існавала.

Некаторыя нязначныя спробы стварыць аматарскі тэатр на беларускай мове можна прасачыць у XVII стагоддзі (школьная драма), у другой палове XIX і ў пачатку XX стагоддзя.

У 1852 годзе, у прыватным тэатры Поляка ў Мінску на б. Кафедральнай плошчы, беларускі драматург Вінцук Дунін-Марцінкевіч сіламі аматарскага гуртка ставіць сваю камічную оперу «Сялянка» (муз. Манюшка). Наступныя-ж свае дзве оперы «Пінская шляхта» (1866) і «Залёты» (1870) паказаць на сцэне яму не ўдаецца, таму што напалоханы паўстаннем 1863 года царскі ўрад распаленым жалезам выпякае самыя найдрабнейшыя спробы нацыянальна-вызваленчага руху.

Аднак, не гледзячы на адвечны нацыянальны прыгнёт і закабаленне, беларускі народ праз увесь час свайго гістарычнага існавання ніколі не пераставаў тварыць, ствараючы выдатныя творы мастацтва, песні, казкі, легенды, розныя гульні і танцы.

Ой, дзе-ж ты, мая доля, падзелася?
Ці ў лесе заблудзілася?
Ці ў вадзе патапілася?
Ці ў агні згарэла?
Каб у лесе заблукала, —
Я-б пайшла, пашукала.
Каб у вадзе патапілася, —
Я-б вады напілася.
Каб на агні згарэла, —
Я-б рукі пагрэла, —

так пяецца ў старажытнай народнай беларускай песні часоў прыгоннага права.

У цудоўных паэтычных вобразах крыецца глыбокі соцыяльны змест, бяспраўнасць народа, яго адвечная нянавісць да паноў, якая іншы раз адкрыта гнеўна выражаецца ў песні:

Не пайду дадому,
А тут заначую,
Журбы не пачую,
Не пайду у двор,
Буду начаваці,
Буду кукаваці.
Забі, божа,
Ціўуна злога,
Пана ліхога.

З даўнасці вядома, якой любоўю ў народа карысталіся скамарохі, вандруючыя камедыянты, «ряженые». У Беларусі вялікай папулярнасцю ў дарэвалюцыйныя годы карысталіся валачобнікі.

На каляды, на масляным тыдні хлопцы і дзяўчаты вырэзвалі з бяросты маскі, вывернуўшы кажухі ўверх аўчынай, апраналіся мядзведзямі, бусламі, козамі і з музыкай і песнямі хадзілі («валачыліся») па вёсках і сёлах, уносячы радасць і вясёласць у курныя сялянскія хаты.

Вялікай папулярнасцю ў гарадах у дарэвалюцыйныя годы карысталася беларуская батлейка (лялькавы тэатр-вертэп).

Невялікая двухстворчатая скрыня, у якой змяшчалася мініяцюрная сцэна, лёгка ставілася на звычайныя сані і рукамі перавозілася ад дома да дома па вуліцах гарадскіх прадмесцяў.

Біблейскія сцэны, якімі звычайна пачыналася выступленне батлейкі (батлейка — ад слова Віфлеем), змяняліся свецкімі прадстаўленнямі, у якіх прымалі ўдзел адпаведныя персанажы: поп, цыган, стражнік і г. д.

Асаблівай папулярнасцю ў беларускай батлейцы карыстаўся спрытны і зваротлівы прастак Мацей. Ён умудраўся заўсёды з гонарам выйсці з любога цяжкага становішча, у якое трапляў з-за сваёй беднасці і бяспраўнага становішча.

У дзесятых гадах нашага стагоддзя вялікім поспехам карысталіся выступленні беларускага музычна-драматычнага гуртка, арганізаванага і ўзначальваемага вядомым стылізатарам беларускіх народных танцаў Ігнатам Буйніцкім, сярод іх: «Юрачка», «Лявоніха», «Крыжачок», «Мяцеліца», «Гневаш», «Цярэшка» і іншыя.

Апрача танцаў і беларускіх народных песень, якія выконваў хор пад кіраваннем Л. Рагоўскага, гурток ставіў таксама невялікія п'есы: «Модны шляхцюк» Каруся Каганца, «У зімовы вечар» Элізы Ажэшка.

Не гледзячы на тое, што ў рэпертуары ... нявi...ныя ва ўсіх адносінах бытавыя камедыі і вадэвілі, усё-ж за яго выступленнямі пільна сачыла напалоханая рэвалюцыяй 1905 года царская паліцыя, чынячы ўсякія перашкоды ў яго рабоце.

На вёсцы, куды гурток час-ад-часу выязджаў, было таксама не лягчэй. Вось што пішуць гуртkоўцы ў сваіх успамінах:

«Вельмі цяжка было атрымаць дазвол на спектаклі. Які-небудзь станавы прыстаў, перш чым даць дазвол, заўсёды пытаўся:

— Які такі тэатр?
— Беларускі.
— На якой мове іграеце?
— На беларускай.
— Не ведаю такой мовы, не магу дазволіць».

У часе нямецкай і белапольскай акупацый становішча беларускіх аматарскіх тэатральных гурткоў было яшчэ больш цяжкім і бязрадасным.

У часе белапольскай акупацыі дазволы на спектаклі даваліся так званымі палітычнымі камісарамі, ад іх волі залежала існаванне аматарскіх гурткоў.

У Мінску, напрыклад, у 1919 годзе быў такі «палітычны камісар» пан Фастовіч. Гэты бравы акупант забараняў усякую п'есу, дзе спаміналіся словы «соцыяліст», «рэвалюцыянер» і г. д. Так былі забаронены п'есы «Раскіданае гняздо» Янкі Купалы, «Антось Лата» Якуба Коласа і інш. Камедыю «Паўлінка» Янкі Купалы пан Фастовіч таксама доўгі час не згаджаўся дазволіць, таму што, бачыце, у ёй, праўда хоць і не ясна, але ўсё-ж гаворыцца аб тым, што адна з дзеючых асоб, настаўнік Якім Сарока, — соцыяліст. Наогул, матывы да забароны п'ес у пана Фастовіча былі самыя рознастайныя. Так, напрыклад, яму вельмі не падабалася, што ў п'есе «Многа крыві»— «вельмі многа смерцей» (яго паметкі на цэнзурных экземплярах). Трагедыі Шэкспіра напэўна прывялі-б пана Фастовіча ў свяшчэнны жах, але, на шчасце, ён іх не чытаў.

«Трэба граць по-кольвек смешнага, жэбы весёло было», — нязменна гаварыў гэты пан.

І сапраўды, калі мы прагледзім рэпертуар, прыкладам, такога поўпрафесіянальнага тэатра, якім было першае «Таварыства беларускай драмы і камедыі», арганізаванае ў Мінску ў 1917 годзе і меўшае прытулак на Коннай плошчы ў драўляным бараку, што насіў вельмі салідную назву «Клуб «Беларуская хата», то ўбачым, што рэпертуар гэтага таварыства амаль цалкам складаўся з розных камедый, вадэвіляў і фарсаў, калі і ставілася якая-небудзь драма, часцей за ўсё меладрама, то да яе абавязкова прышпільваўся вясёлы вадэвіль, які павінен быў хоць крыху развеяць невясёлы настрой гледача, што складаўся пераважна з жыхароў гарадской ускраіны Камароўкі, дзе находзіўся клуб.

Вось тыповая для «Таварыства беларускай драмы і камедыі» праграма (пераклад з рускай мовы):

«Беларуская хата 27 ліпеня 1918 года.

Трупай Першага Беларускага Таварыства Драмы і Камедыі будзе прадстаўлена:

1. «Хам», драма ў 4-х актах Э. Ожэшка.

2. «Міхалка», камедыя ў 1-м акце Далецкіх.

Пасля спектакля танцы да 2-х гадзін ночы, а таксама карты, лато, пошта.

Іграе духавы аркестр музыкі, буфет з гарачай закускай і моцнымі напіткамі.»

(Газ. «Новый вестник» № 131. Мінск, 1918 год.).

Што ўяўляла сабою мастацтва «Таварыства беларускай драмы і камедыі», можна меркаваць па тым, што ў яго распараджэнні на трохметровых падмостках драўлянай сцэны «Хаты», амаль пазбаўленых куліс, заўсёды знаходзіліся дзве дэкарацыі: выразаны лес з жывапісным заднікам і двухбаковы павільён — а) вясковая хата, б) мяшчанская кватэра. Увесь рэквізіт і ўся бутафорыя змяшчаліся ў адным куфры.

Акторы ў большасці былі аматарамі, якія па вечарах за некалькі марак (доля ад выручкі) з прыемнасцю прымалі ўдзел у прымітыўных ва ўсіх адносінах спектаклях, спявалі ў хоры, танцавалі ў балеце. Большасць іх былі людзі самых розных прафесій, але беспрацоўе, поўная адсутнасць сродкаў для існавання штурхала іх на хоць-якую працу, а «Хата» усё-ж давала пару грошай.

Першае «Таварыства беларускай драмы і камедыі» нікім не субсідыравалася.

Стыхійна ўзнікаўшыя аматарскія тэатральныя гурткі, нікім не падтрымліваемыя, шпарка рассыпаліся, акторы разыходзіліся, праследуемыя касымі позіркамі акупанцкай паліцыі.

Яшчэ дыміліся вогнішчы спаленых адступаўшых белапалякамі дамоў, яшчэ грымелі стрэлы схаваўшыхся ў лесе бандытаў, калі 14 верасня 1920 года ў вызваленым Чырвонай Арміяй Мінску Народны камісарыят асветы Беларусі адкрыў першы Дзяржаўны Беларускі драматычны тэатр.

Першыя годы свайго існавання Беларускі тэатр, шырока выкарыстоўваючы прадастаўленыя яму савецкім урадам сродкі, арганізацыйна ўмацоўваецца, камплектуе акторскі склад, хор, балет, аркестр, тэхнічныя цэхі.

У склад трупы ўваходзяць акторы-прафесіяналы з рускай і ўкраінскай сцэны: Г. Ю. Грыгоніс, В. Н. Крыловіч, Е. Э. Міронава, Л. І. Ржэцкая і моладзь з аматарскіх гурткоў: А. К. Ільінскі, К. Н. Саннікаў, С. М. Станюта, О. Е. Вашкевіч, І. Ф. Жданові, В. В. Быліпскі, Б. В. Платонаў, Э. П. Шапко, Е. С. Рамановіч, В. Н. Полла, В. Н. Гаратаў, Г. П. Злотнікаў (памочнік рэжысёра) і інш.

Праз год з гэтага складу вылучаецца група таварышоў—А. К. Ільінскі, К. Н. Саннікаў, О. Е. Вашкевіч, С. М. Станюта і накіроўваецца ў Маскву, у арганізаваную ў 1921 годзе Беларускую тэатральную студыю. Па сканчэнні студыі ў 1926 годзе гэтыя таварышы ўваходзяць у склад Другога Дзяржаўнага Беларускага драматычнага тэатра, арганізаванага ў Віцебску.

Большасць астатніх таварышоў і па сённяшні дзень працуе ў Беларускім тэатры, прайшоўшы з ім увесь яго складаны 20-гадовы шлях.

Балетмайстрам тэатра быў запрошан К. А. Алексютовіч, мастакамі—С. П. Марыкс і К. Елісееў.

Галоўным рэжысёрам, фактычным мастацкім кіраўніком тэатра становіцца вядомы актор і драматург Еўсцігней Афінагенавіч Міровіч, дзякуючы выключнай энергіі і вялікаму тэатральнаму вопыту якога ў тыя цяжкія часы поўнай гаспадарчай разрухі і яшчэ нясконачанай грамадзянскай вайны Дзяржаўны Беларускі драматычны тэатр адразу-ж пачынае творчае жыццё.

Асноўную сваю работу тэатр праводзіць у сталіцы рэспублікі — Мінску, у памяшканні Гарадскога тэатра, адзіным тэатральным памяшканні ў горадзе, адпавядаючым элементарным патрабаванням сучаснага спектакля.

Польскія паны і царскія чыноўнікі, якія на працягу доўгіх год гісторыі кіравалі так званымі заходнімі абласцямі б. Расійскай імперыі, зусім не клапаціліся аб культурным жыцці насельніцтва. У гарадах і мястэчках Беларусі было вельмі многа велізарных, багатых касцёлаў і праваслаўных сабораў і амаль не было добрых тэатральных памяшканняў. У Гомелі тэатра зусім не было. Магілеўскі тэатр больш нагадваў гваардзейскую казарму, чым тэатр. У Віцебску архіерэй забараніў будаваць тэатр бліжэй, чым за тысячу крокаў ад сабора, і яго пабудавалі ў канцы горада, на рынку, побач з астрогам і вар'яцкім домам.

Цяпер у Савецкай Беларусі шмат прыгожых тэатральных будынкаў і клубаў, шмат новых тэатральных калектываў, але гэта ўжо плады сталінскіх пяцігодак.

У першыя годы рэвалюцыі Беларускаму Дзяржаўнаму драматычнаму тэатру прышлося па-братняму дзяліцца тэатральным памяшканнем з Рускім і Яўрэйскім тэатрамі. І ў адкрыцці Першага Дзяржаўнага Беларускага драматычнага тэатра, як відаць з захаваўшайся афішы, па-братняму прымалі ўдзел Рускі і Яўрэйскі тэатры. У дзень адкрыцця ўсімі калектывамі быў сумесна выкананы «Інтэрнацыянал», пасля чаго глядач убачыў паказаную Беларускім тэатрам інсцэніроўку аповесці Э. Ожэшка «Рысь», Яўрэйскім тэатрам—«Унзэр Вінкл» («Наш кут»), «Меншн» («Людзі») і Рускім тэатрам — «Васелле» Чэхава.

Адкрыццё прайшло не без поспеху, аб чым сведчаць водгукі прэсы. Такім чынам Беларускі тэатр атрымаў, што называецца, пуцёўку ў жыццё. Перад калектывам маладых савецкіх актораў адкрылася шырокая дарога творчай працы на карысць росквіту нашага нацыянальнага па форме і соцыялістычнага па зместу мастацтва.

Адказны рэдактар І. Д. ГУРСКІ.

Мінск, друкарня «Звязды» Адрас рэдакцыі газеты: Мінск, Савецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-384. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у дэкаду.

Ул. Галоўлітбел...